Заснавальнікі — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда» і грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Рэгістрацыйны № 12.

16 МАЯ 2008 г. ПЯТНІЦА № 19 (15523)

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

# АЗДАРАЎЛЕННЕ =
## РАЦЫЯНАЛЬНАЕ ХАРЧАВАННЕ + СПОРТ — ТЭЛЕВІЗАР

**430 тысяч беларускіх дзяцей ва ўзросце ад 6 да 18 гадоў плануецца аздаравіць сёлетнім летам. Пры гэтым 227 тысяч дзяцей будуць аздараўляцца ў лагерах з дзённым знаходжаннем, а больш як 23 тысячы школьнікаў і выхаванцаў пазашкольных устаноў адпачнуць у аздараўленчых лагерах экалагічнага, краязнаўчага, мастацкага, турыстычнага і іншых профіляў.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА

**Сума датацый на пуцёўкі для дзяцей узрасла** ў параўнанні з мінулым годам. Датацыя ў аздараўленчыя лагеры з кругласутачным знаходжаннем складзе 220 тысяч рублёў (у мінулым годзе было 185 тысяч рублёў), у аздараўленчыя лагеры з дзённым знаходжаннем — 90 тысяч рублёў (было 70 тысяч). А датацыя на адну пуцёўку ў профільныя аздараўленчыя лагеры з кругласутачным знаходжаннем тэрмінам на 9 дзён павялічылася з 80 да 100 тысяч рублёў у гэтым годзе.

На жаль, але ў новым летнім канікулярным сезоне колькасць стацыянарных аздараўленчых лагераў, гатовых прыняць дзяцей, зноў зменшыцца. Сёлета будзе задзейнічаны толькі 201 лагер. Увогуле, пачынаючы з 90-х гадоў, беларуская дзятва пазбавілася ўжо больш як ста стацыянарных лагераў, матэрыяльная база якіх прыйшла ў непрыдатны стан і не магла далей выкарыстоўвацца для адпачынку і аздараўлення школьнікаў. Вось і ў гэтым годзе зачыніліся яшчэ 16 стацыянарных аздараўленчых лагераў.

— Магчыма, некаторыя з іх праз нейкі час зноў змогуць прыняць дзяцей, — падзялілася сваімі думкамі з журналістам «Звязды» **загадчыца аддзялення гігіены дзяцей і падлеткаў Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Ала МАЛАХАВА**. — Вось, напрыклад, сёлета ў нас адчыняюцца пасля капітальнага рамонту 5 лагераў, чатыры з іх належаць мінскім прадпрыемствам, а адзін размешчаны на тэрыторыі Віцебскай вобласці. Колькасць задзейнічаных у аздараўленні школьнікаў санаторна-курортных устаноў пачала змяншацца. Калі два гады назад гэта былі 58 устаноў, летась — 42, то ў гэтым годзе, па інфармацыі Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва, 36 санаторна-курортных арганізацый.

Дарэчы, літаральна напрыканцы красавіка пастановай Міністэрства аховы здароўя былі зацверджаны новыя «Гігіенічныя патрабаванні да ўладкавання, утрымання і арганізацыі рэжыму ў аздараўленчых лагерах» (Санітарныя нормы, правілы і гігіенічныя нарматывы), якія аб'ядналі многа іншых дакументаў, што з'явіліся за апошнія гады. Згодна з санпінамі, працягласць аздараўлення дзяцей у перыяд летніх канікулаў павінна быць не менш за 18 рабочых дзён, а аптымальны варыянт, на думку медыкаў, для аздараўлення — гэта 21 дзень. Максімальная колькасць у атрадах дзяцей ва ўзросце ад 6 да 9 гадоў не павінна перавышаць 25 чалавек, ва ўзросце ад 10 да 14 гадоў — 30 чалавек, і ва ўзросце ад 15 да 18 гадоў — не больш як 25 чалавек.

Летась выражаны аздараўленчы эфект назіраўся ў 81,4 працэнта дзяцей, слабы аздараўленчы эфект — у 15,9 працэнта выпадкаў, а ў 2,7 працэнта прайшоўшых аздараўленне дзяцей чаканы эфект, на жаль, адсутнічаў.

Між іншым, бацькам, якія адпраўляюць сваё дзіця ў лагер, не пашкодзіць ведаць, што санітарнай службай прапісаны да дробязяў літаральна ўсе моманты знаходжання на аздараўленні іх дзіцяці. Так, купацца ў адкрытых вадаёмах дазваляецца толькі ў сонечныя і бязветраныя дні пры тэмпературы вады не ніжэй за плюс 20 градусаў і паветра — не ніжэй за плюс 23 градусы.

У далейшым, пасля тыдня рэгулярнага купання, пры тэмпературы вады не ніжэй за плюс 16 градусаў — для асноўнай групы дзяцей і плюс 18 градусаў — для дзяцей падрыхтоўчай групы па фізічным выхаванні. Купанне праводзіцца адзін раз у дзень, але ў спякотныя дні дазваляецца таксама паўторнае купанне. Час знаходжання ў вадзе ў першы дзень складае ад 7 да 10 хвілін, штодня ён паступова павялічваецца і можа дасягаць 25 хвілін. Загаранне дапускаецца толькі ў ранішнія гадзіны (з 9.00 да 11.00) ці пасля 16 гадзін. Загараць дзецям аптымальна пры тэмпературы паветра не вышэй за + 25 градусаў.

Праўда, традыцыйна першы летні месяц не цешыць беларусаў ласкавым цяплом, таму некалькі год запар у стацыянарных аздараўленчых лагерах нават даводзілася адкладваць пачатак першай змены. Усё ж такі 40 працэнтаў стацыянарных лагераў не могуць пахваліцца наяўнасцю ўласных ацяпляльных сістэм.

— Па санітарных нормах у памяшканнях, дзе знаходзяцца дзеці, тэмпература не можа апускацца ніжэй за 18 градусаў, а вільготнасць павінна быць у межах 30—60 працэнтаў, — тлумачыць Ала Малахава. — Да таго ж абавязковай умовай з'яўляецца забеспячэнне душавых і ўмывальнікаў (як для рук, так і для ног) гарачай вадой.

Адлегласць аздараўленчых паходаў для дзяцей ва ўзросце ад 7 да 9 гадоў не можа перавышаць 4—5 кіламетраў (працягласць — адзін дзень), а для дзяцей, якім ужо споўнілася 10 гадоў, ад 8 да 10 кіламетраў у дзень (працягласць — не больш як два дні). Хуткасць руху — не больш як 3 кіламетры ў гадзіну з перапынкамі на адпачынак на 10—15 хвілін праз кожныя 45—50 хвілін хады.

Рэгулюецца таксама і вага асабістага груза дзіцяці: 2,5 кг — для дзяцей ад 10 да 12 гадоў, 3—3,5 кг — ад 13 да 14 гадоў і 4—4,5 кг — ад 15 да 17 гадоў. Непасрэдна заплечнік без рыштунку павінен важыць не больш як 1 кілаграм.

Харчаванне павінна быць ашчадным па хімічным саставе: кухарам забараняецца выкарыстоўваць вострыя прыправы, сокі, напоі, прыгатаваныя з сухіх канцэнтратаў, і натуральную каву. Пераважны спосаб прыгатавання — варка, тушэнне і прыгатаванне страў на пары.

Вараныя каўбасы і сасіскі, якія, дарэчы, прысутнічаюць у хатнім харчаванні ледзь не штодня, дапускаецца ўключаць у меню не больш як два разы на тыдзень. Рыба, яйкі, сыр, тварог, смятана — 2—3 разы на тыдзень. А вось такія прадукты, як малако, сметанковае масла, алей, хлеб, крупы, мяса, садавіна і гародніна, павінны ўваходзіць у рацыён дзяцей штодня. Пры пяціразовым харчаванні ў стацыянарных лагерах на снеданне павінна прыпадаць 20—25 працэнтаў ад агульнай каларыйнасці рацыёну, на абед — 30—35, на полудзень — 15 працэнтаў, вячэру — 20 працэнтаў і другую вячэру — 5 працэнтаў.

У якасці другой вячэры рэкамендуецца спажыванне кісламалочных прадуктаў. Адным словам, толькі адзінкі з бацькоў могуць стварыць для сваіх дзяцей дома такі рацыянальны рэжым харчавання...

Устаноўлены абмежаванні і на прагляд тэлеперадач: не больш як 1,5 гадзіны ў дзень — для навучэнцаў малодшых класаў і не больш як 2,5 гадзіны ў дзень — для навучэнцаў сярэдніх і старшых класаў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Спецыяльны карэспандэнт «Звязды» перадае з Канады

# РАСІЯНЕ ЧАКАЮЦЬ КАНАДЦАЎ?

2008 WORLD CHAMPIONSHIP CANADA Halifax Québec City — IIHF — 2008 CHAMPIONNAT MONDIAL CANADA Halifax Ville de Québec

**Учора нацыянальная зборная Беларусі па хакеі афіцыйна афарміла сабе пропуск на Алімпійскія гульні-2010 у Ванкувер. Гэта стала рэальнасцю пасля таго, як зборная Канады ў Галіфаксе перайграла нарвежцаў — 8:2. Вікінгі хоць і віртуальна, але заставаліся адзінымі прэтэндэнтамі на запаветнае 9-е месца пры ўмове выйгрышу ў чвэрцьфінальным матчы ў гаспадароў турніру.**

Беларуская каманда практычна ўся пакінула межы Канады, за выключэннем некаторых членаў афіцыйнай дэлегацыі, якія пасля фінальнага матча, назначанага на 18 мая ў Квебеку, адправяцца ў Манрэаль на кангрэс IIHF. Дарэчы, менавіта на гэтым прадстаўнічым хакейным саміце павінен быў вырашыцца лёс сусветнага першынства 2014 года, на правядзенне якога прэтэндуе беларуская сталіца з улікам узвядзення «Мінск-Арэны». Аднак, як стала вядома, вырашэнне гэтага пытання адкладзена на цэлы год — гаспадар ЧС-2014 будзе названы пасля правядзення наступнага чэмпіянату свету-2009 у Швейцарыі. У Манрэалі ж сустрэча хакейных босаў будзе прысвечана выбарам новага прэзідэнта Міжнароднай федэрацыі хакея. Відавочна, што і гэтая працэдура будзе звычайнай фармальнасцю, бо на крэсла кіраўніка IIHF на сёння толькі адзін прэтэндэнт — цяперашні прэзідэнт швейцарац Рэне Фазел, які займае гэты пост з 1994 года. Можна не сумнявацца, што спадар Фазел будзе ўзначальваць хакейны свет чарговыя 7 гадоў.

Зрэшты, кіраўнік IIHF у Квебеку даволі актыўны. Так, нядаўна ён правёў цэлую прэс-канферэнцыю, прысвечаную хакейнаму матчу расійскай кампаніі «Газпрамэкспарт» супраць астатніх зорак свету узору 80—90-х гадоў мінулага стагоддзя. У радах расійскай рэтра-каманды — віцэ-прэзідэнт «Газпрама» Аляксандр Мядзведзеў, хакейныя зоркі Вячаслаў Фяцісаў, Ігар Ларыёнаў, Валерый Каменскі, Аляксандр Якушаў, Уладзімір Лутчанка...

Выхад расійскай зборнай у чвэрцьфінал, а цяпер і ў паўфінал быў азнаменаваны прыездам шматлікіх турыстаў. Як вынік — з паліц гандлёвых лавак, размешчаных ў фае лядовага палаца Colisee Pepsi, зніклі не толькі майкі з надпісам OVECHKINA — расійскага легіянера «Вашынгтон Кэпіталз», але і сувенірныя клюшкі, шайбы, бейсболкі... Павышаны попыт на гэты тавар стварыў сапраўдныя чэргі за ўсім тым, што яшчэ засталося на паліцах.

У Квебеку значна пацяплела — адчуваецца сапраўдны прыход вясны і зборнай Канады, якая танкам прайшлася па сваіх сапэрніках у Галіфаксе. Ужо сёння відавочна, што канадцам, як арганізатарам 72-га чэмпіянату свету, застаецца адзін крок да фіналу — гульня са шведамі, якія напярэдадні ў авертайме перайгралі чэхаў — 3:2. Рэальным сапернікам роданачальнікаў хакея ў барацьбе за залатыя медалі з'яўляецца каманда Расіі, якая паўторна, ужо ў чвэрцьфінале, перайграла каманду Швейцарыі (6:0).

**Уладзімір ЗДАНОВІЧ,** *г. Квебек.*

***P.S.*** *На гэтым камандзіроўка журналіста «Звязды» ў Канаду завяршаецца. Праўда, дзякуючы форварду беларускай зборнай Міхаілу Грабоўскаму, спецыяльнаму карэспандэнту «Звязды» ўдалося пабываць у Манрэалі ў святая святых канадскага хакея — легендарным клубе «Манрэаль канадзіенс», які налета адзначыць 100 гадоў. Там жа Міхаіл Грабоўскі пагадзіўся на невялічкую фотасесію ў фірменнай «амуніцыі» газеты «Звязда».*

Міхаіл ГРАБОЎСКІ:

# «У МАІХ МАРАХ — ДАКРАНУЦЦА ДА КУБКА СТЭНЛІ»




**Форвард беларускай нацыянальнай зборнай і легіянер «Манрэаль канадзіенс» Міхаіл ГРАБОЎСКІ — чалавек просты і даступны для фанатаў. Нягледзячы на тое, што ў цяперашнім клубе яго галоўны трэнер Гі Карбона трымае мінчаніна на лаўцы запасных, Міхаіл у выдатнай форме. Сваю прафпрыдатнасць Грабоўскі пацвердзіў і на сёлетнім чэмпіянаце свету.**

І вось журналіст «Звязды» ў кампаніі з калегамі-тэлевізійнікамі ў Мішыным «Крайслеры». Дапамагаю па карце хутка выехаць на манрэальскую трасу. Да дзелавога мегаполіса — 260 кіламетраў...

Па аўтабане абмежаванне хуткасці ў 120 км. Але мы ляцім ракетай. Раз-пораз трапляюцца дарожныя інспектары з радарамі. Прычым у засадзе за рэкламнымі шчытамі.

**— Проста як у нас, — пачынаю размову з Грабоўскім. — Міша, ты любіш хуткасць?**

— А чым дарога адрозніваецца ад хакейнай пляцоўкі?! Хуткасць — гэта мая стыхія.

**— Як ацэньваеш вынікі выступлення нацыянальнай зборнай на чэмпіянаце свету ў Квебеку?**

— Думаю, што маглі выступіць і лепш. У любым выпадку збіраліся выйграць у швейцарцаў, пра датчан маўчу. Так што камандзе па 5-бальнай сістэме можна паставіць «здавальняюча».

**— А сабе?**

— Таксама мог бы згуляць лепей. Але то шайба не ішла ў вароты, то недзе хваляваўся залішне. Я заслугоўваю той жа адзнакі, што і каманда.

**— Беларускія балельшчыкі пасля матча з датчанамі выказалі думку, што каманда проста «плавіла» Курта Фрэйзера.**

— У нас нармальны мікраклімат у камандзе, таму ні аб якім «плаўленні» настаўніка каманды і размовы быць не можа. Кожны з нас гуляў не за галоўнага трэнера, а за краіну, за свой гонар. А балельшчыкам, увогуле, хацелася выказаць удзячнасць за гарачую падтрымку.

**— Зразумела, што дасканаласці няма межаў. Але ж як можна ўдасканальвацца, калі трэнер «Манрэаль канадзіенс» Гі Карбона трымае цябе на лаўцы запасных?**

— Гэта лепш спытаць у яго. Але ж я ўсё роўна падтрымліваю сябе ў належнай форме, каб у любы момант выйсці на пляцоўку.

**— Пагаварыць па душах з канадскім трэнерам не атрымліваецца?**

— Гэта, мякка кажучы, не вітаецца ў камандзе. Ёсць такое няпісанае правіла: трэнер — гэта капітан карабля, і яму павінны ўсе падпарадкоўвацца без усялякіх там размоў.

**— Напэўна, што неяк расставіць кропкі над «і» ўсё ж такі трэба.**

— Не магу дакладна сказаць, як зрабіць лепш. У многіх яшчэ свежая ў памяці гісторыя, калі Міша Грабоўскі самавольна пакінуў родны «Манрэаль канадзіенс» і вырашыў вярнуцца ў «Гамільтон», дзе пачынаў сваю заакіянскую кар`еру. І што з гэтага атрымалася? Я быў вернуты ў Манрэаль.

**— Гэта быў выклік галоўнаму трэнеру?**

— Лічы, што так. Не выключаю, што такі рашучы ход толькі падліў масла ў агонь у адносінах Карбона да Грабоўскага.

**— Тым не менш ты поўны аптымізму за будучае?**

— А інакш навошта брацца за работу, якую ты не пацягнеш.

**— Якія ў цябе адносіны з братамі Касціцынымі?**

— Нармальныя рабочыя адносіны. Можна сказаць, прафесійныя.

**— Пра закадычнае сяброўства не скажаш?**

— Мае ўсе верныя сябры знаходзяцца ў Беларусі. Хоць у «Манрэалі канадзіенс» ёсць ігракі, з якімі я падтрымліваю дружалюбныя адносіны.

**— Твой бацька Юрый Аляксандравіч і дзед Аляксандр Кузьміч, якія хварэлі за зборную Беларусі (і Міхаіла Грабоўскага асабліва) на чэмпіянаце свету ў Канадзе, збіраюцца дадому праз некалькі дзён пасля фінальнай гульні. А ты калі?**

— Напачатку я хачу іх бачыць у Манрэалі, пазнаёміць з горадам, з маім клубам. Праўда, білеты да Мінска ў мяне на канец мая і перабіваць на 21-е чысло не буду — трэба яшчэ справы ўтрэсці ў Канадзе. Як-ніяк, кантракт у мяне з «Манрэаль канадзіенс» закончыўся. І перад паездкай на радзіму, дзе я планую прабыць некалькі месяцаў, трэба шмат чаго паспець зрабіць тут.

**— У цябе ў Манрэалі службовая кватэра і машына?**

— Не, безумоўна. За жыллё і транспарт я штомесяц плачу з уласнай кішэні — грашыма, якія зарабляю ў клубе. Гэта ў Расіі за цябе могуць заплаціць па ўсіх рахунках і накарміць у дадатак. А тут — зусім іншыя жыццёвыя прынцыпы.

**— У Манрэалі ты плаціш падаткі?**

— А як жа. Прычым стаўка амаль 50 працэнтаў ад кантракта.

**— Міша, наколькі я ведаю, за табой у Квебеку літаральна па пятах хадзіў прэзідэнт хакейнага клуба «Дынама» (Масква) Міхаіл Галаўкоў і прапанаваў на выгадных фінансавых умовах перабрацца ў Маскву.**

— Ведаеш, пакуль я знаходжуся ў «Манрэаль канадзіенс», а на час майго ад'езду ў Мінск мой агент будзе ўладжваць пытанні майго далейшага працаўладкавання ў цяперашнім клубе, з'язджаць у Расію не бачу сэнсу, няхай і на больш выгадных фінансавых умовах. Як-ніяк, Канада — гэта радзіма хакея, і тут хакей — гэта рэлігія. У тым жа Манрэалі за табой могуць натоўпам хадзіць фанаты, каб атрымаць аўтограф. Адкуль у іх такая цяга да хакея? У крыві, відаць.

**— У цябе ёсць запаветная мара?**

— А як жа. Я хачу, як і любы ігрок НХЛ, дакрануцца да Кубка Стэнлі. Думаю, што гэтая мара Міхаіла Грабоўскага не з'яўляецца завоблачнай. І для яе ўвасаблення ў жыццё я буду прыкладаць усе сілы, якія ў мяне ёсць.

**Уладзімір ЗДАНОВІЧ,**
*Квебек — Манрэаль — Квебек.*

Чытачам газеты "Звязда" ад Міхаіла Грабоўскага з найлепшымі пажаданнямі. М.Г. 14.05.2008

# *Мы вучым італьянскую мову, а італьянцы — беларускую!*

**Недзе гадоў 500 таму ў італьянскім горадзе Падуя наш зямляк Францыск Скарына вучыўся ў мясцовым універсітэце. І цалкам верагодна, што яго сябры-таварышы раз-пораз прасілі яго: «Спадар Францішак, а навучы нас трохі па-вашаму, па-ліцвінску гутарыць!». І я мяркую, што Скарына не мог адмовіць сваім італьянскім сябрам у некалькіх уроках старабеларускай мовы. Вось ужо пяць стагоддзяў мінула, дзесяткі пакаленняў сышлі ў нябыт, а такі з'яўляюцца на італьянскай зямлі людзі, у якіх беларуская мова выклікае цікавасць.**

...Прагортваў я некалькі дзён таму стужку навінаў у Інтэрнэце ды выпадкова знайшоў цікавую аб'яўку. Калі каротка пераказаць змест, то дзяўчына з Італіі звярталася да беларускіх карыстальнікаў Інтэрнэту па дапамогу ў напісанні магістарскай працы пра... беларускую мову! «Ого! Тут роднай мовай не кожны беларус цікавіцца. А вось на табе: італьянцы пішуць па-беларуску! — падумаў я і звязаўся з гэтай італьянкай, якая не толькі ведае беларускую мову, але і даследуе яе».

Дзяўчыну завуць Лідзія. Лідзія Федэрыка Мацытэлі. Нарадзілася яна ў 1984 годзе ў Рыме, дый і сёння там жыве. Пяць гадоў таму яна паступіла ў рымскі ўніверсітэт «Sapienza» на спецыяльнасць «Замежныя мовы». Там упершыню і даведалася, што існуе беларуская мова. Але хай Лідзія пра гэта распавядзе сама:

— Я выбрала нямецкую, рускую і славенскую мовы, потым вывучала таксама харвацкую і польскую. Цяпер вучуся на спецыяльнасці «Славянскае мовазнаўства» і хачу паступіць у магістратуру. На лекцыях рускай мовы я ўпершыню пачула пра беларускую мову — наш прафесар сказаў нам, што кафедры беларускай мовы ў нас няма. Тады я вырашыла, што калі-небудзь вывучу гэтую цікавую мову, якой самі яе носьбіты не хочуць карыстацца. Спачатку часу і магчымасцяў не было, я нават не ведала нікога, хто б мог размаўляць па-беларуску ў Рыме. А ўлетку 2006 года я паехала ў Пецярбург і пазнаёмілася з беларускім хлопцам, праўда, рускамоўным, але ён мяне сяму-таму навучыў. Мы пасябравалі, потым я пазнаёмілася з іншымі беларусамі і тады ўжо стала сур'ёзна цікавіцца беларускай мовай і культурай. У лютым 2007 года ў Варшаве мне студэнтка беларускай філалогіі падарыла фільм на беларускай мове. Я глядзела яго разоў 100 (ажно вывучыла на памяць) і так пакрысе спасцігала беларускую мову.

***— Лідзія, а колькі моў ты ведаеш? Як вучыла нашу мову?***

— Я ведаю больш-менш 10 моў — якую лепш, якую горш. Беларуская мне далася не асабліва цяжка, бо я ўжо ведала рускую і польскую мовы. Але ж павінна сказаць, што ў беларускай мове ёсць свой асабісты «персаналітэт»: нельга проста гаварыць, што гэта сумесь рускай і польскай, як мне даводзілася чуць. Яна іншая, яна мае свае характэрныя рысы. Спачатку вашу мову вучыла праз фільмы, песні і мэйлы сяброў, якіх папрасіла пісаць мне па-беларуску нават тады, калі мовы яшчэ добра не ведала. У італьянскім продажы ніякіх беларускіх кніжак няма, але ва ўніверсітэцкай бібліятэцы знайшла падручнік і кнігі: Купалы, Коласа.. Але мала. Вельмі дапамагае Інтэрнэт. Там падручнікі, слоўнікі, кнігі он-лайн. Але найперш праз Інтэрнэт магчыма размаўляць з беларускамоўнымі людзьмі.

***— А ты адна вывучаеш у сваім універсітэце беларускую мову ці яшчэ хто?***

— На жаль, я з'яўляюся зараз адной студэнткай беларускай мовы, дый нават не беларускай мовы, а славянскага мовазнаўства. Кафедры беларускай мовы ў нас пакуль няма. А вось кафедра славістыкі даволі вялікая.

**(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)**

## ДАБРАЧЫННАСЦЬ ПАСЛЯ ЗАГСА

**У Віцебску нараджаецца добрая традыцыя — маладыя адразу пасля рэгістрацыі шлюбу едуць у Дом дзіцяці, каб перадаць падарункі маленькім выхаванцам.**

Як расказала «Звяздзе» галоўны ўрач Віцебскага гарадскога дома дзіцяці Ала Шапкіна, зараз тут жывуць 152 хлопчыкі і дзяўчынкі ва ўзросце да 4 гадоў. Гэтая ўстанова — адзіная ў Віцебскай вобласці. У адных выхаванцаў бацькі асуджаны, у іншых — знаходзяцца ў вышуку, пазбаўлены бацькоўскіх правоў... Сёлета 10 дзяцей усынавілі, 6 вярнулі ў сем'і... Штомесяц на пражыванне і абслугоўванне кожнага дзіця трацiцца прыкладна 1,5 мільёна рублёў. Агульная сума запазычанасці бацькоў па кампенсацыі выдаткаў дзяржавы складае больш за 318 мільёнаў рублёў. Толькі трое з ліку абавязаных робяць пералічэнні добраахвотна. Акрамя маладых пар ёсць нямала прадпрымальнікаў, якія аказваюць самую розную дапамогу.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## СОТАВІК ЗА... ФАЛЬШЫЎКІ

**У Лідзе пяцёра падлеткаў папаліся на вырабе і збыце падробных грашовых купюр Нацыянальнага банка: паводле слоў затрыманага «друкара», навучэнца музычнага вучылішча, яму ўдалося збыць фальшывак на агульную суму каля 1 мільёна рублёў.**

Як паведаміла карэспандэнту «Звязды» оперупаўнаважаны па асабліва важных справах упраўлення па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі МУС Вераніка Пасмеццева, махляры канкрэтна «засвяціліся» пасля няўдалай спробы набыць у мясцовага жыхара сотавы тэлефон за 450 тысяч рублёў: мужчына своечасова зарыентаваўся і ўбачыў, што грошы несапраўдныя. Потым высветлілася, што падсунуць фальшыўкі чалавеку хацелі сябры навучэнца вучылішча, які і «штампаваў» падробкі. Між іншым, трое з іх вучацца ў згаданым ужо вучылішчы, а чацвёрты — вучань 8-га класа школы. Як сцвярджае затрыманы, у лютым ён вырабіў фальшывак на агульную суму каля трох мільёнаў рублёў, частку з якіх потым знішчыў. У ходзе вобыскаў, праваахоўнікамі канфіскавана падробак больш як на мільён рублёў.

**Ігар ГРЫШЫН.**

Калі вы падпісаліся на газету **«Звязда» на III квартал або 2-е паўгоддзе 2008 года** — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце яе **да 2 ліпеня** ў рэдакцыю на адрас:
**220013 Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А**.

Падпісчык можа выйграць **у якасці прызоў гадзіннікі, майкі, бейсболкі, 7 тэлевізараў «Віцязь» і СУПЕРПРЫЗ — ХАЛАДЗІЛЬНІК «АТЛАНТ»**. Розыгрыш прызоў праводзіцца **8 ліпеня 2008 г.**, вынікі публікуюцца ў газеце «Звязда» **да 12 ліпеня**.

Атрымаць прыз можна ў рэдакцыі **да 20 верасня 2008 г.** пры прад'яўленні квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на III квартал або 2-е паўгоддзе 2008 года і пашпарта. Дастаўку тэлевізараў і халадзільніка ажыццяўляе рэдакцыя. **Пасля 20 верасня** выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца.

**Больш падрабязна правілы гульні «Падпішыся на «Звязду» чытайце ў нумары газеты за 30 красавіка 2008 года. Удачы ў гульні!**

Тэрмін правядзення гульні — з 30.04.08 па 10.07.08.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 1036 ад 25.04.08, выдадзена Міністэрствам гандлю РБ.

**2 Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на III квартал або 2-е паўгоддзе 2008 года**

**Прозвішча, імя, імя па бацьку** ______________________

______________________

**Падпіска аформлена і аплачана ў** ______________________
(аддзяленне сувязі)

______________________ **на III кв. або 2-е паўг. 2008 года**

**Хатні адрас і тэлефон** ________ (індэкс) ______________________

______________________

______________________

Удачы ў розыгрышы!

Ф.СП-1 Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь

АБАНЕМЕНТ на газету ЗВЯЗДА з бясплатнымі ўкладкамі: «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «СВАЯ СПРАВА», «ТВАЕ ПРАВЫ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

(індэкс выдання)

Колькасць камплектаў

на 2008 год па месяцах

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | | |

Каму (прозвішча, ініцыялы)
Куды (адрас)
(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА на газету ЗВЯЗДА з бясплатнымі ўкладкамі: «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «СВАЯ СПРАВА», «ТВАЕ ПРАВЫ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

(індэкс выдання)

| ПВ | месца | літар |
|---|---|---|

| Кошт | падпіскі | ______ руб. | Колькасць камплектаў |
|---|---|---|---|
| | пераадрасоўкі | ______ руб. | |

на 2008 год па месяцах

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | | |

Каму (прозвішча, ініцыялы)
Куды (адрас)
(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

Абітурыенту-2008

# Настаўнік-географ з майстэрствам экскурсавода

**Новая спецыяльнасць «Геаграфія. Экскурсійна-краязнаўчая работа» з прысваеннем выпускнікам кваліфікацыі «Выкладчык. Педагог-арганізатар» адкрыецца ў наступным навучальным годзе ў Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя М. Танка.**

Паводле слоў дэкана факультэта прыродазнаўства Наталлі Навуменкі, колькасць вучэбных гадзін, якія адводзяцца на вывучэнне геаграфіі ў праграме школы, у апошнія гады істотна скарацілася. Таму маладыя спецыялісты часта сутыкаюцца з неабходнасцю браць дадаткова нагрузку па зусім незнаёмых для іх вучэбных дысцыплінах. Ці кола школ, куды іх могуць размеркаваць, абмяжоўваецца патрэбай школы ў спецыялістах адначасова па дзвюх канкрэтных спецыяльнасцях, напрыклад, геаграфія і біялогія ці геаграфія і беларуская мова і літаратура. Між іншым, новая дадатковая спецыяльнасць дазволіць настаўніку-географу кваліфікавана выконваць функцыі педагога-арганізатара, займацца гуртковай работай, прычым як у школах, так і ў шматлікіх пазашкольных установах выхавання і навучання, а таксама па-за сценамі ўстаноў педагагічнага профілю. Такім чынам, дыяпазон запатрабаванасці выпускніка істотна пашыраецца. Напрыклад, сёння патрэбу ў маладых спецыялістах маюць Мінскі гарадскі інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў, Мінскі дзяржаўны турыстычна-экалагічны цэнтр дзяцей і моладзі, Рэспубліканскі экалагічны цэнтр дзяцей і юнацтва, Рэспубліканскі цэнтр турызму і краязнаўства навучэнскай моладзі.

Змест навучання па новай дадатковай спецыяльнасці ўключае такія дысцыпліны, як асновы батанікі і заалогіі, арганізацыя батанічных і заалагічных экскурсій, этнаграфія Беларусі, краязнаўства, экскурсійная справа, турыстычныя рэсурсы і арганізацыя турыстычнай дзейнасці, тэхналогія, методыка і арганізацыя краязнаўчай і экскурсійнай работы. Таксама плануецца глыбокае вывучэнне гісторыі Беларусі, тапанімікі, музейнай справы і г.д.

Акрамя практык, прадугледжаных першай спецыяльнасцю, на працягу навучання будуць арганізоўвацца экскурсійна-турыстычная і краязнаўчая практыкі, падчас якіх студэнты будуць вывучаць прыродную і культурную спадчыну канкрэтнага рэгіёна, распрацоўваць маршруты экскурсій рознай накіраванасці (помнікі прыроды, турыстычныя сцежкі, экалагічны, сельскі, аграрны турызм, этнатурызм і г.д.).

— Пакуль правядзенне практык запланавана толькі на тэрыторыі Беларусі, — паведаміла Наталля Навуменка, — аднак нам вельмі хацелася б, каб з'явілася магчымасць арганізацыі выязных практык у рамках абмену з іншымі ВНУ, напрыклад, расійскімі ці ўкраінскімі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Лідарскі дар

# УЗБІЦЬ МАСЛА, НЕЛЬГА ПАТАНУЦЬ

## МАЛАДАЯ ЗАГАДЧЫЦА НЕ ПАСУЕ НІ ПЕРАД ЯКІМІ ЦЯЖКАСЦЯМІ

Памятаеце хрэстаматыйную гісторыю пра двух жабак у малацэ — адна здалася і патанула, а другая цялёпкалася што было моцы і... узбіла масла. Вам якая бліжэй? Нашай новай гераіні — **Ірыне ЦЯРЭШЧАНКА, маладой загадчыцы дзіцячага садка** — бясспрэчна, тая, што не здаецца. Яна па жыцці лідар — настойлівая, мэтанакіраваная, з дзелавой хваткай. Аднак партрэт будзе няпоўным, калі мы не скажам вам, што 28-гадовая Ірына не толькі прадпрымальны кіраўнік, але і маладая мама — мяккая, ласкавая, клапатлівая. Хіба не ідэальнае спалучэнне для таго, хто працуе з дзецьмі? Ды і гаспадыня яна адменная.



**САЛАТА З КРАПІВЫ**

Кажуць, жанчына можа зрабіць з нічога тры рэчы: скандал, капялюшык і салацік. Для першага Ірына Цярэшчанка занадта спакойная і ўраўнаважаная, а вось з касцюмам і салатай — усё ў парадку. І шые сама (нават марыла стаць швачкай), і салату гатуе цудоўную, а галоўнае — з таго, што пад рукой ёсць.

— Зайшоў аднойчы сусед у госці да мужа, — успамінае Ірына, — накарміла іх, чым было. Асабліва ўпадабаў ён салату. Ды так хваліў, што аж пасля патэлефанавала мне яго жонка і пытаецца: «Ну што там за дзіўная салата? Падзяліся рэцэптам!». А там усяго толькі яйкі, агуркі і... крапіва! Яе калі ашпарыш, яна па смаку нагадвае пекінскую капусту. Толькі капуста грошай каштуе, а крапівы ля плота — бяры не хачу!

Гастранамічныя вынаходніцтвы ў Ірыны яшчэ з тых часоў, калі ўсёй сям'і даводзілася жыць на 120 тысяч рублёў у месяц: мужа звольнілі, Ірына ў дэкрэце з малым дзіцем на руках. Вось на тыя «дэкрэтныя» і харчаваліся. Цяпер і муж на працу ўладкаваўся, і Ірына садок узначальвае, аднак на ашчаднасць не забываецца. Для падмогі агарод трымае, без яго, кажа, у вёсцы ніяк.

— Я прызвычаілася жыць па сродках, нават калі яны мізэрныя, — кажа жанчына, а для гаспадыні гэта ўменне ледзь не самае важнае.

**РЭАРГАНІЗАЦЫЯ ЗАМЕСТ ЗАКРЫЦЦЯ**

Ірына прайшла шлях па кар'ернай лесвіцы ад выхавальніка да загадчыцы. І не само ўсё ў рукі плыло — наадварот, сваю працу даводзілася літаральна адстойваць. Дзіцячы прытулак у вёсцы Краснае, які ўзначальвала Ірына, збіраліся расфарміроўваць. Бяздомных малых было не так многа, таму прытулак вырашылі далучыць да маладзечанскага. Аднак маладая загадчыца правяла маніторынг і высветліла, што зачынены прытулак варта...ператварыць у дзіцячы садок. Усё казала на карысць рэарганізацыі:

— Суседні садок перапоўнены ды і вадзіць туды дзяцей нязручна — занадта далёка. А тут у нас ёсць і памяшканне, і зладжаны калектыў, — даводзіць Ірына. — Таму я вырашыла абысці сем'і сваіх патэнцыяльных выхаванцаў і запытаць, як ім такая ідэя. Да гутаркі сур'ёзна падрыхтавалася — першнаперш паставіла сябе на месца тых людзей, да якіх звярталася. Як мама, я сама цудоўна разумею, што важна для бацькоў — каб былі вопытныя выхавальнікі, каб ад дома блізка і ўвагі дзецям хапала. Усё гэта мы маглі забяспечыць — і выхавальнікі добрыя ёсць, і размяшчэнне ўдалае, і садок невялікі, таму да кожнага выхаванца ў нас індывідуальны падыход. Для малых гэта важна, бо ім яшчэ трэба прызвычаіцца да садка, а старэйшым ужо да школы рыхтавацца трэба.

Ахвотнікаў вадзіць сваіх дзяцей у будучы садок аказалася дастаткова, бацькі нават падпісалі калектыўны зварот. А ініцыятыўная загадчыца разлічыла бізнэс-план на тры гады наперад — як мінімум на гэты час выхаванцаў хопіць, а значыць, садок у вёсцы будзе запатрабаваны. Мясцовая ўлада смелы план падтрымала — і ледзь паспеў зачыніцца прытулак, як тут жа адчыніўся на яго месцы садок. З той жа назвай — «Бярозка» (месца тут вельмі маляўнічае — азярцо, цудоўны бярозавы гай), але з новымі выхаванцамі — 17 маленькімі жэўжыкамі.

**КРЫК — ПЕРШАЯ ПРЫМЕТА СЛАБАСЦІ**

Маладая загадчыца цэніць у падначаленых жаданне працаваць — маўляў, калі чалавек прагне працы, то ўсяму навучыцца. У стасунках з імі ёй заўжды дапамагае ўменне ставіць сябе на месца іншых.

— Праца з кадрамі — вельмі цікавая і складаная адначасова, тым больш, што жаночы калектыў мае сваю спецыфіку. Ёсць такія кіраўнікі, якія кажуць: «Чым тлумачыць некаму, я лепш сам зраблю». Аднак гэта няправільна — сам усё і за ўсіх не зробіш ды і немэтазгодна гэта. Кіраўнік — гэта каманда, важна ўмець арганізаваць яе працу. Вядома ж, бывае і цяжкавата. Іншы раз даводзіцца і ўласным прыкладам на нешта заахвоціць. Памятаю, трэба было шафу перанесці, а працаўніку аднаму не дужа хацелася гэтым займацца. Я яму кажу: «Давайце я з гэтага боку, а вы з таго». Яму няёмка стала, ён запратэставаў: «Не, не, зараз мужыкоў папрашу». Выкананую працу я шчыра цаню, ніколі не скуплюся на пахвалу, нават калі людзі выконваюць свае прамыя абавязкі. Тыранам быць нельга. Нас яшчэ ў педагагічным каледжы вучылі: «Крык — гэта першая прымета слабасці», таму я ніколі не павышаю голас на падначаленых.

Скажу шчыра, Ірыну ў такой ролі і ўявіць цяжка: яна лагодная, ветлівая, і голас у яе вельмі ціхі, мяккі, амаль дзіцячы.

— У нас з калектывам узаемаразуменне і ўзаемадапамога, — працягвае маладая загадчыца. — Дзе я сваіх працаўнікоў падмяню, дзе яны мне пасуперажываюць: «Ай-ай-ай, Віктараўна, ты сёння цэлы дзень на нагах, ні на хвіліну не прысела і разам з намі усё рабіла». Я ж акрамя сваёй працы стараюся па меры магчымасці нешта зрабіць і разам з калектывам — гэта няблага для агульнай атмасферы. У працы важная выніковасць — не трэба выседжваць час, варта паспець зрабіць тое, што патрабуецца. Па ўважлівай прычыне магу і адпусціць раней. Сама калі што падмяню — я працу свайго калектыву дасканала ведаю, здолею падмяніць кожнага. І яны гэта цэняць. Многія, хто аказваецца ў садку ў маю адсутнасць, здзіўляюцца: «Загадчыца на цэлы дзень па справах паехала, а ўсе працуюць». Так, сапраўды, ніхто не будзе біць лынды, нават калі мяне няма на працоўным месцы. Людзі любяць казаць «Кіраўнік — сам сабе начальнік». Няпраўда! Кіраўнік таксама падпарадкоўваецца і яшчэ больш, чым хто іншы. Калі выхавальнік падначалены загадчыцы, то загадчыцы прад'яўляюць патрабаванні і пажарныя, і санстанцыя, і аддзел адукацыі.

Аднак Ірына прызнае таксама і тое, што пры ўсіх цяжкасцях праца кіраўніка прыносіць куды больш задавальнення.

**ТЫ ПРАВЫ ШНУРОК ЗАВЯЗВАЙ, А З ЛЕВЫМ Я ТАБЕ ДАПАМАГУ**

Самыя прыемныя моманты ў працы маладой загадчыцы — тыя, што прайшлі побач з дзецьмі. Ірына расказала нам, што як толькі стамляецца ад папяровай працы, нервовых праверак, клопатаў і непрыемнасцяў, ідзе да малых выхаванцаў. «Яны ж такія жвавыя, ласкавыя. Пабудзеш з імі — і становіцца лягчэй, бо бачыш сэнс сваёй працы, гэта ж усё для іх». Педагог па адукацыі, Ірына прымае непасрэдны ўдзел у распрацоўцы навучальнай часткі выхавання. Пра выхаванне дзяцей маладая жанчына ведае не толькі ў тэорыі: у самой падрастае — трохгадовая Сонечка. Некаторыя выхаванцы садка пад кіраўніцтвам Ірыны — аднагодкі яе дачкі.

— Дзетак у нас няшмат, група рознаўзроставая, — расказвае загадчыца. — І ў гэтым ёсць шмат плюсоў: такая мадэль выхавання вельмі падобная На сямейную. Не ў кожнай жа сям'і нараджаюцца блізняты — звычайна ёсць старэйшыя і малодшыя дзеці. Так і ў нас. Малыя цягнуцца да старэйшых і хочуць ні ў чым ад іх не адставаць, старэйшых мы вучым клапаціцца пра малодшых. І яны з задавальненнем малых апякуюць, нават шнуркі дапамагаюць завязваць. Ты, кажуць, правы завязвай, а з левым я табе дапамагу. Разам яны куды хутчэй з усім спраўляюцца. А вось навучальныя заняткі мы праводзім па падгрупах з цікавымі назвамі — «малыя», «чамучкі» і «фантазёры». Пакуль у фантазёраў, скажам, развіццё мовы, чамучкі малююць. Развіццё мовы, дарэчы, — і па-беларуску, і па-руску. У нас ёсць пяцёра выхаванцаў, якія налета пойдуць у школу. У іх заняткі больш сур'ёзныя і працяглыя. Малым пакуль яшчэ цяжкавата канцэнтраваць увагу і засяроджвацца на вучобе. Навучанне ва ўсіх ідзе ў лёгкай для ўспрымання гульнявой форме.

Нядаўна ў садок закупілі новыя цацкі на радасць малым. Яны з задавальненнем вывучаюць правілы дарожнага руху, знаёмяцца са з'явамі прыроды, а больш за ўсё любяць тэатральныя заняткі.

— Тэатр для дзетак не толькі прыемны і цікавы, але і вельмі карысны — ён дапамагае малым разняволіцца, — тлумачыць Ірына. — Ёсць дзеткі, што ад прыроды пабайчэй, а ёсць і баязлівыя, замкнёныя. Малы і хацеў бы пагуляць разам з усімі, але саромеецца. Зусім іншае, калі ён бярэ ў ручкі, скажам, зайчыка ці медзведзяня — ён жа ўжо не ад сябе кажа! Так працей сябе праявіць. Таму пад тэатр мы плануем выдзеліць асобны пакойчык — каб і сапраўдная заслона была, і глядацкія месцы.

Марамі маладой загадчыцы пакуль застаюцца экалагічная сцяжына для дзетак і дзіцячая дарога — каб маленькія пешаходы вучыліся правілам руху і пазнавалі прыродныя з'явы на практыцы. Аднак у такіх кіраўнікоў, як Ірына, ад мары да справы звычайна недалёка! Таму не здзіўлюся, калі праз некаторы час у малых выхаванцаў будзе міні-метэастанцыя з дажджамерам, ісці да якой давядзецца праз дарогу выключна на зялёнае святло.

Ірына Цярэшчанка любіць паўтараць, што вынік працы выхавальніка бачны не адразу — як мінімум праз год. А вынік працы загадчыцы, відаць, і таго пазней — праз некалькі пакаленняў малых наведвальнікаў садка, які жыве, развіваецца. Ірына бачыць шляхі гэтага развіцця, таму вынікі ўласнай працы, верым, яе не расчаруюць. Тым больш, што яна ніколі не здаецца.

**Ала МАЧАЛАВА,** *Мінскі раён.*
**Фота аўтара.**

Конкурсы

# Прыярытэт — за якасцю

**«Лепшы менеджар па якасці» і «Лепшая дыпломная і навукова-даследчая работа студэнтаў у галіне менеджменту і кантролю якасці» — конкурсы пад такімі назвамі ў чарговы раз аб'яўлены ў межах Дзяржаўнай праграмы «Якасць» на 2007—2010 гады.**

**Мэта гэтых конкурсаў — садзейнічанне развіццю навукова-даследчай дзейнасці ў галіне менеджменту і кантролю якасці, павышэнне аўтарытэту спецыялістаў у гэтай сферы і прыцягненне маладых кадраў. Акрамя таго, фарміраванне ў рэспубліцы кадравага саставу, які б валодаў сучаснымі метадамі і падыходамі ў галіне менеджменту якасці, будзе спрыяць павышэнню канкурэнтаздольнасці айчыннай прадукцыі і паслуг на знешнім і ўнутраным рынках.**

**«ЛЕПШЫ МЕНЕДЖАР ПА ЯКАСЦІ»**

Узяць удзел у конкурсе могуць спецыялісты ці кіраўнікі службаў якасці арганізацый Рэспублікі Беларусь усіх формаў уласнасці, якія дасягнулі значных вынікаў у галіне менеджменту якасці і якія працуюць у гэтай сферы не менш чым тры гады. Абавязковай умовай з'яўляецца наяўнасць сертыфікаванай сістэмы менеджменту якасці ў арганізацыі, якую прадстаўляе ўдзельнік.

Конкурс праводзіцца па некалькіх намінацыях:

- для менеджараў па якасці арганізацый сферы вытворчасці колькасцю больш чым 5000 працуючых;
- для менеджараў па якасці арганізацый сферы вытворчасці колькасцю ад 1000 да 5000 працуючых;
- для менеджараў па якасці арганізацый сферы вытворчасці колькасцю ад 500 да 1000 працуючых;
- для менеджараў па якасці арганізацый сферы вытворчасці колькасцю да 500 працуючых;
- для менеджараў па якасці арганізацый сферы паслуг колькасцю да 100 працуючых;
- для менеджэраў па якасці арганізацый сферы паслуг колькасцю больш чым 100 працуючых.

У адпаведнасці з Палажэннем аб конкурсе ўдзельнік павінен прадставіць справаздачу, якая ўтрымлівае:

- кароткі агляд дзейнасці арганізацыі;
- апісанне крытэрыяў ацэнкі дзейнасці ўдзельніка конкурсу (у таблічнай форме).

Ацэнка прадстаўленных дакументаў праводзіцца конкурснай камісіяй па наступных крытэрыях: практычныя вынікі функцыянавання сістэмы менеджменту якасці арганізацыі; асабісты ўклад удзельніка конкурсу ў яе распрацоўку, укараненне і ўдасканальванне; яго навуковая і практычная дзейнасць у галіне якасці.

Арганізацыя, якая прадстаўляе сваіх менеджараў па якасці для ўдзелу ў конкурсе, павінна падаць да 1 верасня 2008 года заяву, анкету ўдзельніка і справаздачу аб яго рабоце ў галіне менеджменту якасці ў сакратарыят Рэспубліканскай конкурснай камісіі.

**«ЛЕПШАЯ ДЫПЛОМНАЯ І НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАЯ РАБОТА СТУДЭНТАЎ У ВОБЛАСЦІ МЕНЕДЖМЕНТУ І КАНТРОЛЮ ЯКАСЦІ»**

Да ўдзелу ў конкурсе дапускаюцца студэнты 4—5 курсаў, студэнты-выпускнікі і магістранты ВНУ Беларусі незалежна ад формы ўласнасці.

Конкурс праводзіцца па наступных намінацыях: «Лепшая дыпломная работа ў галіне менеджменту якасці», «Лепшая дыпломная работа ў галіне кантролю якасці», «Лепшая навукова-даследчая работа ў галіне менеджменту якасці», «Лепшая навукова-даследчая работа ў галіне кантролю якасці».

Конкурс праводзіцца ў два этапы.

На першым этапе дзяржаўная экзаменацыйная камісія і прафілюючая кафедра вызначае лепшыя работы, якім прысвойваецца статус фіналіста адбору ў межах ВНУ.

Студэнт-фіналіст да 1 верасня 2008 года павінен падаць у сакратарыят Рэспубліканскай конкурснай камісіі:

- суправаджальны ліст аб накіраванні дыпломнай (навукова-даследчай) работы фіналіста адбору ў межах ВНУ для ўдзелу ў рэспубліканскім конкурсе;
- пратакол адбору ў межах ВНУ;
- кароткае апісанне работы, анатацыю да яе, прэзентацыю, выкананую ў праграме PowerPoint, звесткі аб аўтары і кіраўніку работы.

На другім этапе ў адпаведнасці з устаноўленымі крытэрыямі праводзіцца экспертыза дыпломных і навукова-даследчых работ.

...

Пераможцы конкурсаў будуць узнагароджаны дыпломамі на спецыяльнай цырымоніі ў час правядзення рэспубліканскіх мерапрыемстваў, прымеркаваных да Сусветнага дня якасці.

Сакратарыят Рэспубліканскай конкурснай камісіі сфарміраваны на базе Беларускага дзяржаўнага інстытута стандартызацыі і сертыфікацыі: 220113, г. Мінск, вул. Мележа, 3, к. 410а, тэл.:(017) 262 11 65, факс: (017)262 15 20, e-mail: consl@belgiss.org.by

# У ЖАНРЫ МЕЛАДРАМЫ...

**Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь сумесна з Беларускім рэспубліканскім саюзам моладзі, Беларускім саюзам кінематаграфістаў, Саюзам пісьменнікаў Беларусі, нацыянальнай кінастудыяй «Беларусьфільм» і Беларускім відэацэнтрам праводзяць адкрыты маладзёжны конкурс на стварэнне літаратурнага сцэнарыя мастацкага фільма ў жанры меладрамы.**

Аўтары павінны накіраваць на адрас Дэпартамента па кінематаграфіі Міністэрства культуры (пр. Пераможцаў, 11, 220004, г. Мінск) з паметкай «На конкурс» заяву, літаратурны сцэнарый (у двух экзэмплярах), копіі старонак дакумента, які пацвярджае асобу, дзе змяшчаюцца звесткі аб прозвішчы, імені, імені па бацьку, даце і месцы нараджэння, месцы жыхарства (пашпарт грамадзяніна Рэспублікі Беларусь, нацыянальны пашпарт грамадзяніна замежнай дзяржавы, пасведчанне на права жыхарства ў Рэспубліцы Беларусь, іншы дакумент, які ўтрымлівае звесткі, якія пацвярджаюць асобу заяўніка).

Падвядзенне вынікаў конкурсу пройдзе ў перыяд з 1 кастрычніка па 30 лістапада 2008 года. Пераможцы атрымаюць дыпломы і грашовыя прэміі ў памеры 60 базавых велічынь (першая), 50 базавых велічынь (другая), 40 базавых велічынь (трэцяя). Аргкамітэт плануе зацвердзіць і дадатковыя прызы і дыпломы, а таксама заахвоціць удзельнікаў іншымі спосабамі. Вынікі конкурсу і ўзнагароджанне пераможцаў будзе ажыццяўляцца 17 снежня 2008 года падчас святкавання Дня беларускага кіно. Сцэнарыі-прызёры будуць рэкамендаваны для экранізацыі на нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм».

**Алена КРАВЕЦ.**

Абітурыент-2008

# *«Разведка боем»*

Скарыстацца апошняй магчымасцю даведацца ўсё аб прыёмнай кампаніі абітурыенты Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта змогуць у Дзень адчыненых дзвярэй, які пройдзе 17 мая ў актовай зале філалагічнага факультэта БДУ (вул. К. Маркса, 31). На ўсе іх пытанні будуць адказваць члены прыёмнай камісіі ўніверсітэта.

Дзень адчыненых дзвярэй будзе арганізаваны ў два патокі: з 10.00 да 12.00 на філфаку чакаюць тых, хто збіраецца паступаць на гуманітарныя і эканамічныя спецыяльнасці, а з 14.00 да 16.00 — маладых людзей, якіх цікавяць спецыяльнасці прыродазнаўча-навуковага профілю.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Акцыі

# ВЕЛАПРАБЕГ — У КАМІЗЭЛЬКАХ

**Супрацоўнікі Дзяржаўтаінспекцыі вырашылі расказаць і паказаць веласіпедыстам і пешаходам, што яны ў цёмны час сутак павінны абазначаць сябе святлоадбівальнымі элементамі.**

Для гэтай мэты былі задзейнічаны сілы саміх міліцыянераў, а таксама членаў БРСМ на чале з Анатолем Базюком і першым сакратаром райкама БРСМ Марынай Кутовіч.

Акцыя пачалася ў Астраўцы. Каля 15 актывістаў маладзёжнай арганізацыі ў святлоадбівальных камізэльках на веласіпедах, у суправаджэнні міліцэйскай машыны з уключанымі маячкамі чырвонага і сіняга колераў, праехалі з пачатку райцэнтра праз плошчу да РАУС. Адтуль веласіпедысты накіраваліся да лясгаса і вярнуліся ў пункт адпраўлення.

Падчас велапрабегу ўдзельнікі прадэманстравалі прахожым, якіх было нямала на вуліцах Астраўца, што выкарыстанне святлоадбівальных элементаў і язда на веласіпедзе — гэта здарова і актуальна.

**Аляксандр СЯНЮЦЬ.**

# МЫ ВУЧЫМ ІТАЛЬЯНСКУЮ МОВУ...



**Лідзія (у цэнтры) са сваімі італьянскімі сяброўкамі каля возера непадалёк ад Рыма.**

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)***

***— Ці была ты калі-небудзь у Беларусі? Якія ўражанні засталіся?***

— Так, першы раз я была ў 2006 годзе ў Мінску, але толькі адзін дзень. Потым вярнулася ў лютым 2008 года і жыла тут 17 дзён, каб сабраць матэрыял для магістарскай працы. Была ў Мінску, Брэсце і Мікашэвічах, жыла ў сваіх беларускіх сяброў. Так што, можна сказаць, бачыла краіну «знутры». Мне ў Беларусі вельмі спадабалася. Перш за ўсё тое, што я магла проста падысці да любога чалавека і загаварыць па-беларуску. Кожная размова па-беларуску была прыгодай. Для мяне і для маіх суразмоўцаў.

***— Лідзія, а што твае суайчыннікі ведаюць пра Беларусь?***

— Вельмі мала: шмат хто думае, што гэта частка Расіі, альбо што «дзесьці на Ўсходзе»... Аднак пра беларускіх прыгажунь і ў нас часам чуецца, вашыя жынчыны лічацца вельмі прыгожымі, дарэчы, як рускія і ўкраінскія. Цікава, што ў італьянскай мове «прыгожая» — гэта «bella». Таму Белая Русь гучыць амаль што як «Прыгожая Русь».

***— А як ставяцца твае бацькі і сябры да таго, што ты вывучаеш славянскія мовы?***

— Ну... Кажуць, што магла б выбраць больш «нармальныя» мовы. Але ў цэлым добра, бо бачаць, што я задаволеная, і ім гэтага дастаткова.

***— А як ты мяркуеш, чаму ж беларусы не размаўляюць на беларускай мове? Застанецца наша мова ці знікне зусім?***

— Ну, ці знікне беларуская мова зусім, гэтага я не ведаю. Спадзяюся, што не. Але яна ў небяспецы. Да гэтых часоў былі вёскі, дзе і захоўвалася мова, але цяпер, калі маладыя людзі ўсё імігруюць у горад... Не ведаю, сітуацыя цяжкая. Але не безнадзейная.

Чаму не размаўляюць? Цяпер мне здаецца, што ў саміх беларусаў няма волі да раскрыцця сваіх каранёў. Яны жывуць так, па-тутэйшаму. А гэтае «па-тутэйшаму» з кожным днём усё больш і больш падобна на «па-руску»...

Ну і напрыканцы Лідзія расказала некалькі гісторый, што адбыліся з ёй, калі яна гасцявала ў нашай краіне. Ну вось, напрыклад. Чакала Лідзія ў Брэсце аўтобуса. І пакуль чакала, разгаварылася з мясцовай бабулькай. Бабулі, відаць, сумна было стаяць на прыпынку, яна і ўзрадавалася выпадковай суразмоўцы, ды не простай, а з Італіі. І пачала даводзіць, што «правильно, надо по-белорусски разговаривать». Ды толькі тут у гутарку ўмяшалася другая бабуля: «А когда надо по-белорусски, то чего же ты по-русски говоришь?» Так слова за слова — і бабулькі пачалі лаяцца. Ды толькі ўмяшалася Лідзія: папрасіла бабулечак на пустым месцы не сварыцца, бо ўсе мовы на свеце прыгожыя. З гэтай думкай усе і пагадзіліся, а сваркі не адбылося. Потым, праз тры дні, Лідзія на тым жа самым прыпынку зноў сустрэла тую ж самую бабульку. Зноў пачалі гутарыць пра жыццё-быццё. А тут на табе — падыходзіць яшчэ нейкая бабуля (во народ у нас які цікаўны!) ды давай сумнявацца ў італьянскім паходжанні нашай гераіні: маўляў, падманвае, не з Італіі яна... Аднак першая бабуля на сумненні не паддалася і ўстала на абарону Лідзіі. А зараз вось Лідзія перажывае, што не дадумалася тады паказаць свой італьянскі пашпарт, і спадзяецца, што бабулька-такі не лічыць яе ашуканкай...

...А ўлетку Лідзія Федэрыка Мацытэлі зноў збіраецца прыехаць у Беларусь. Праўда, ненадоўга. Каб пабачыцца са сваімі сябрамі і пагаварыць па-беларуску. З намі, з беларусамі. Мы ж яшчэ не забыліся мовы сваёй. Праўда?..

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

# ЗДАРОВЫ ПАДЛЕТАК — ЛЕПШЫ ПАДЛЕТАК

**У Мінску завяршыўся трохдзённы міжнародны навучальны семінар на тэму «Медыка-сацыяльныя аспекты здароўя падлеткаў».**

Ён прайшоў у рамках сумеснага праекта Міністэрства аховы здароўя нашай краіны, Шведскага ўсходне-еўрапейскага камітэта і Дзіцячага фонду ААН (ЮНІСЕФ). Назва праекта — «Здаровы падлетак».

У семінары ўдзельнічалі прадстаўнікі ўсіх рэгіёнаў Беларусі — пераважна прадстаўнікі ўпраўленняў аховы здароўя абласных выканаўчых камітэтаў, «Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра «Маці і дзіця», іншых зацікаўленых устаноў і арганізацый.

У ходзе работы семінара адбыўся зацікаўлены абмен думкамі і прапановамі па захаванні і ўмацаванні здароўя падрастаючых пакаленняў.

**Леанід ТУГАРЫН.**

# Перамога на Мендзялееўскай алімпіядзе

**6 узнагарод рознай вартасці прывезлі з Ташкента, дзе завяршылася 42-я Міжнародная Мендзялееўская алімпіяда па хіміі, беларускія школьнікі: два залатыя, тры сярэбраныя і адзін бронзавы медаль.**

Міжнародная Мендзялееўская алімпіяда школьнікаў па хіміі з'яўляецца пераемніцай Усесаюзнай хімічнай алімпіяды і працягвае яе нумарацыю. Яе пераможцы атрымліваюць унікальную магчымасць паступіць без экзаменаў у Маскоўскі дзяржаўны ўніверсітэт і іншыя прэстыжныя ВНУ. Сёлета ўдзел у ёй узялі школьнікі з Беларусі, Расіі, Украіны, Узбекістана, Азербайджана, Латвіі, Эстоніі, Румыніі і Балгарыі і іншых краін.

Алімпіяда праходзіла ў тры туры. Гонар Беларусі адстойвалі 6 адзінаццацікласнікаў і ўсе яны вярнуліся дамоў з медалямі. На «золата» былі ацэнены веды Паўла Чулкіна (Ліцэй БДУ) і Валерыя Каснерыка (СШ № 22 г. Мінска). Сярэбраныя медалі — у Глеба Гарбацэвіча (Ліцэй БДУ), Дзмітрыя Дойнікава (СШ № 22 г. Мінска) і Андрэя Конанава (СШ № 51 г. Мінска). «Бронза» — у Ганны Сівапләсавай (Ліцэй БДУ).

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Ведай нашых!

# Беларускі хакеіст заваяваў у Квебеку сусветнае «срэбра»

**15-гадовы гамяльчанін Кірыл Голуб даказаў на лёдзе Квебека, што ў нашай краіне добра развіваецца дзіцяча-юнацкі хакей. Юнак заняў другое месца сярод палявых ігракоў у Сусветным фінале конкурсу хакейнага майстэрства, які праводзіўся на арэне ўніверсітэта Лаваль сярод юных хакеістаў у рамках чэмпіянату планеты ў Канадзе і быў прысвечаны 100-гадоваму юбілею Міжнароднай федэрацыі хакея. Кірыл (яго трэнерам з'яўляецца Алег Шлыкаў) уступіў у майстэрстве толькі хлопцу з Германіі Тобіясу Райдэру.**

На радзіме хакея спаборнічалі 104 юныя хакеісты ва ўзросце ад 11 да 16 гадоў. Наймацнейшага ж сярод юных удзельнікаў, якія прадстаўлялі 30 краін свету — ад Фінляндыі да Новай Зеландыі, — вызначалі пры дапамозе тэстаў на хуткасць, уменне валодаць шайбай і дакладнасць кідка. Нагадаю, што Кірыл Голуб, выхаванец ДзЮСШ № 5 Гомеля, паехаў у Канаду дзякуючы перамозе ў рэспубліканскім фінале хакейнага майстэрства, які, дарэчы, праводзіўся падчас час «Кубка Палесся» ў яго родным горадзе.

Мы дазваніліся да Кірыла Голуба, каб павіншаваць гамяльчаніна з поспехам і пацікавіцца, якія ў яго склаліся ўражанні ад Канады, чэмпіянату свету і дзіцячага конкурсу.

— Я нават не думаў, што змагу заняць другое месца ў Сусветным фінале хакейнага майстэрства, — прызнаўся Кірыл, — бо сам ставіў перад сабой мэту — трапіць хоць бы ў наймацнейшую дзесятку.

***— Няўжо недаацэньваў сябе? Што, дарэчы, перашкодзіла ўзняцца яшчэ вышэй?***

— Паўплывала хваляванне. Асабліва ў час выканання кідкоў. У прынцыпе, нерваваліся ўсе ігракі.

***— Што цябе найбольш уразіла ў Канадзе?***

— Вялікая цікавасць людзей да хакея. На матчы прыходзіла вялікая колькасць балельшчыкаў. Нават на дзіцячых спаборніцтвах трыбуны былі поўныя.

***— На гульнях беларусаў хоць пабываў?***

— Не. Мяне аднаго арганізатары не павялі б. Усю групу вадзілі толькі на матч расіян з італьянцамі і чэхамі.

***— Чаму былі выбраны менавіта гэтыя паядынкі?***

— Я наогул лічу, што расіяне абавязкова выйдуць у фінал. Як і канадцы.

***— А хто пераможа?***

— Расіяне, вядома ж!

***— А калі наша зборная згуляе ў фінале?***

— Сказаць цяжка, але, спадзяюся, што ў фінале калі-небудзь беларусы будуць.

***— Што, акрамя хакея, запомнілася ў Квебеку?***

— Стары горад.

***— Якія падарункі табе ўручылі за другое месца?***

— Нічога.

***— Як так? Хоць ад заняткаў у школе па прыездзе на нейкі час вызвалілі, каб ты адаптаваўся, крыху адпачыў?***

— Не. У мяне па дзве трэніроўкі ў дзень, вучуся.

***— Жадаем удасканаліць сваё хакейнае майстэрства і ў будучым добра гуляць за зборную Беларусі.***



Фота з сайта www.belarushockey.com.

НА ФОТА: Кірыла ГОЛУБА віншуе старшыня Беларускай федэрацыі хакея Уладзімір НАВУМАЎ.

**Ірына ПРЫМАК.**


ВЫПІСВАЙЦЕ «ЗВЯЗДУ» НА II КВАРТАЛ 2007 ГОДА З БЯСПЛАТНЫМІ ЎКЛАДКАМІ

НАСЛЕДДЗЕ ЧАРНОБЫЛЮ · МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ (Газета для выбаршчыкаў і дэпутатаў мясцовых Саветаў) · СВАЯ СПРАВА (Бізнэс, эканоміка, фінансы) · ЖЫРАНДОЛЯ (Наш культурны асяродак) · ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА · КУПІ ЛЕПШАЕ! (Тавары, паслугі, цэны) · КРАІНА ЗДАРОЎЯ

| | | |
|---|---|---|
| ДЛЯ ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ | 63850 | 9200 рублёў на месяц<br>27600 рублёў на квартал<br>55200 рублёў на паўгоддзе |
| ДЛЯ ВЕТЭРАНАЎ ВАВ І ПЕНСІЯНЕРАЎ | 63145 | 8700 рублёў на месяц<br>26100 рублёў на квартал<br>52200 рублёў на паўгоддзе |
| ДЛЯ ВЕДАМАСНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ | 63858 | 14700 рублёў на месяц<br>44100 рублёў на квартал<br>88200 рублёў на паўгоддзе |
| ВЕДАМАСНАЯ ПАДПІСКА ДЛЯ ЎСТАНОЎ МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ, МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ | 63239 | 13400 рублёў на месяц<br>40200 рублёў на квартал<br>80400 рублёў на паўгоддзе |
| ПАДПІСКА «ДА ЗАПАТРАБАВАННЯ» ПРАЗ «МІНГАРСАЮЗДРУК» | 63850 | 7700 рублёў на месяц<br>23100 рублёў на квартал<br>46200 рублёў на паўгоддзе |
| | 63145 | 7230 рублёў на месяц<br>21690 рублёў на квартал<br>43380 рублёў на паўгоддзе |
| | 63858 | 10330 рублёў на месяц<br>30990 рублёў на квартал<br>61980 рублёў на паўгоддзе |

## ПЯТНІЦА, 23 МАЯ

---

5.25, 15.30 Серыял «Тайны следства».
6.20, 7.10, 8.10 Добрай раніцы, Беларусь!
6.30, 7.05 Прэс-агляд.
6.45, 7.45, 19.35 Зона Х.
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 16.00, 18.00, 19.00, 23.20 Навіны.
7.30 Дзелавое жыццё.
8.20 Гатуем разам.
8.35 Сфера інтарэсаў.
9.05, 11.55, 14.55, 17.40, 22.40 Еўрабачанне. Бялград-2008.
9.10, 19.55 Серыял «Доктар Жывага».
10.00 Серыял «Родныя людзі».
10.55, 17.45 Серыял «Сэрцу не загадаеш».
12.15 Драма «Прывалаўскія мільёны».
13.45 Дак. цыкл «Нябачны фронт».
14.00 Гадзіна суда. Справы сямейныя.
14.45 Nota Bene.
15.15, 19.20 Навіны рэгіёна.
16.40 «Жыццё як жыццё». «Замуж за багатага».
21.00 Панарама.
21.45 «Інтуіцыя».
22.50 Фігуры.
23.30 Дзень спорту.
23.40 Баявік «Гангстары».
1.10 Вось дык шоў!

---

6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 0.20, 3.00 Нашы навіны.
6.05 «Наша раніца».
9.05 Серыял. «Таццянін дзень».
10.00 Серыял «Мая цудоўная няня».
11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 0.35, 3.20 Навіны спорту.
11.10 «Модны прыгавор».
12.00 «Малахаў+».
13.10 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
14.10 «Кантрольная закупка».
14.40 «Людзі ў чорным».
15.05 Серыял «Дачка садоўніка».
16.15 Серыял «Агонь кахання».
17.10 «Няхай гавораць» з Андрэем Малахавым.
18.20 «Дакументальны дэтэктыў». «За рысай цярпення».
18.55 Поле цудаў.
20.00 Час.
21.05 «Аргументам і фактам» — 30!». Канцэрт.
22.50 «Наша Belarussia».
23.25 «Сярэбраны грамафон».
0.40 Драма «Народ супраць Лары Флінта».
3.25 «Самы дурны карабель у арміі».
5.05 Маст. фільм «Мерседэс уцякае ад пагоні».
6.30 «Дзеля смеху».

---

6.45, 13.20 Мультсерыял «Звычайны Норман».
7.10 Ранішняя падзарадка.
8.10, 14.55 «Смачна з Барысам Бурдой».
8.45 Серыял «Золата Трoі».
9.35 У гэты дзень.
9.40, 15.30 Гадзіна суда з Паўлам Астахавым.
10.30 Сезон у дачы.
11.00, 16.25 Серыял «Жанчына з водарам кавы».
12.00 Серыял «Макс і кампанія».
12.50 «Цыганскія менестрэлі». Муз. праграма.
13.45 Пазакласная гадзіна.
14.00 Клуб былых жонак.
17.35 Навіны культуры.
17.55 Футбол. Таварыскі матч. Расія — Казахстан. Прамая трансляцыя.
20.00 Калыханка.
20.15 Усё аб бяспецы.
20.45 «Цудоўная сямёрка».
21.30 Баявік «Формула 51».
23.15 Шок-О-ЛАД.
0.15 Казанова.

---

6.00. 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 17.20 «Міншчына».
6.20, 7.40 «Раніца. Студыя добрага настрою».
8.30, 16.50 Серыял «Афрамасквіч 2».
9.00 «Салдаты 14». Серыял.
10.00 «Новыя падарожжы дылетанта».
10.40 «Аўтапанарама».
11.00, 15.30 «Крутыя рабяты». Дзённік.
11.10 Серыял «Жыццё працягваецца».
12.00, 18.25 Серыял «Танга ўтраіх».
12.50, 13.50 «Відавочца прадстаўляе: самае смешнае».
13.00 «Асабісты інтарэс».
14.40 Серыял «Студэнты 2».
15.40 «Я — падарожнік».
16.00 «Ёсць кантакт».
17.30 «Званая вячэра».
20.00, 22.55 «СТБ-спорт».
20.10 «Добры вечар, малы».
20.25 Камедыя «Двайная асечка».
23.00 «Песні маёй душы». Канцэрт Аляксандра Саладухі.
0.30 «Відзьма-нявідзьма».
1.10 Баявік «У пекле».
2.40 «Па поўнай праграме».

---

4.55 Афиша.
5.00, 6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 20.00, 21.00, 22.00, 23.00, 0.00, 1.00 Навіны Садружнасці.
5.05, 7.05, 1.20 Садружнасць live.
5.30 «Жаночы часопіс».
6.05 «Вучым англійскую».
6.20 Тэлемагазін «Удачная пакупка».
6.40 «Цік-так».
7.30, 19.35 «Рандэву з зоркай».
8.05, 16.10 Дак. серыял «Эліта грамадства».
9.05, 17.05 «Гадзіна суда. Справы сямейныя».
10.05 Серыял «Дзікі месяц».
11.05 Серыял «Дзеці Ванюхіна».
12.05, 22.30 Маст. фільм «Леанарда».
14.05 Мультсерыял «Кліфард».
14.30 Серыял «ОБЖ».
15.20, 1.50 «Студыя 60х90».
15.25 Дак. серыял «Купаючыся ў раскошы».
15.55 Афіша прайма.
18.20 Акцэнты.
18.35 «Слава за хвіліну».
20.05 Канцэрт.
21.20 Серыял «Чорны спіс».
1.55 «Бушыдо».

---

7.00, 10.50, 19.30 «Навіны кіно».
7.10, 10.55, 23.35 «Метэапрагноз».
7.15 Маст. фільм «Пякельныя жукі».
9.00 «Дом жывых гісторый».
9.30 «К-відэа» для дзяцей.
9.50 Серыял «Служба расследаванняў».
11.00 Маст. фільм «Хто я».
13.00 «Дзённы тэлечат».
16.30 Мультпарад.
17.00 «Падарожжа з густам».
17.30 «К-гульні».
17.35 Маст. фільм «Французскі канкан».
19.40 Серыял «Служба расследаванняў».
20.45 «Вечарніца».
21.05 «Зялёны дом».
21.20 «Героі коміксаў на экране».
23.10 «Хіт-парад тэлечата».

---

7.00 Добрай раніцы, Расія!
9.00 «Мой сярэбраны шар. Валерый Прыемыхаў».
9.50 Серыял «Сямейныя тайны».
10.45 Весткі. Дзяжурная часць.
11.00, 14.00, 17.00, 19.00 Весткі.
11.25, 19.25 Мясцовы час. Весткі—Масква.
11.45 Серыял «Смерць шпіёнам».
12.45 «У Гарадку».
12.55 Серыял «Зацьменне».
13.50, 16.50, 18.50, 23.00 Весткі—Беларусь.
14.20 «Кулагін і партнёры».
14.55 Суд ідзе.
15.50 Серыял «Рамэо і Джульета».
17.30 Мясцовы час. Весткі—Маскоўская вобласць.
17.50 Серыял «Жанчына без мінулага».
19.50 «Юрмала».
20.50 Добрай ночы, малыя!
21.00 Маст. фільм «Свая тусоўка».
23.10 Трылер «Джыперс Крыперс».

---

7.00 «Добрай раніцы, Расія!»
10.00, 17.25. 0.25 Серыял «Гонка за шчасцем».
10.45, 18.15, 1.10 Серыял «Жанчына без мінулага».
11.30 «Эпізоды». Алена Марозава.
12.10 Серыял «Калі яе зусім не чакаеш».
13.00, 16.00, 19.00, 3.00 Весткі.
13.20 Весткі—Масква.
13.35, 5.15 Маст. фільм «У страляючай глушы».
14.55 Мультфільмы.
15.15, 1.55 «Мой сярэбраны шар. Валерый Прыемыхаў».
16.30 Весткі—Паўночны Каўказ.
16.45 Весткі—спорт.
16.55 «Пецярбург: час і месца».
19.50, 3.45 «Юрмала».
21.20 Маст. фільм «Руская рулетка».
22.40 «Міхаіл Ульянаў у вобразе і ў жыцці».
23.45 «Вакол смеху. Нон-стоп».
2.40 Навіны культуры.

---

6.00 Сёння раніцай.
8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
9.00 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў-8».
10.25 «Перамогшыя смерць».
10.50 «Авіятары».
11.15 Серыял «Сышчыкі-5».
13.35 Серыял «Спроба да ўцёкаў».
15.35 «Агляд. Выратавальнікі».
16.30 Серыял «Вяртанне Мухтара-2».
18.30 «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
19.45 «Следства вялі...».
20.50 «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
21.15 Маст. фільм «Шпіёнскія гульні: жывая бомба».
23.10 Баявік «Прыстанак зла-3».

---

5.00 Канал «Настрой».
7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 18.50, 19.30 Падзеі.
7.45, 10.15, 1.20 Пятроўка, 38.
7.55, 13.45 «Гісторыя дзяржавы Расійскай».
8.00 Маст. фільм.
9.50 Маст. фільм.
10.45 Маст. фільм.
12.40 Дак. фільм «Шчаслівая Лёшка».
13.50 Небяспечная зона.
14.30 Маст. фільм.
15.30 Новая «Часінка».
16.50 Дзелавая Масква.
17.15 Нашы любімыя жывёлы.
17.45 Маст. фільм.
18.55 «Фінал Лігі чэмпіёнаў у Маскве: як гэта было».
20.00 «Смех з дастаўкай на дом».
21.30 «Народ хоча ведаць».
22.35 Падзеі. 25-я гадзіна.
23.05 Маст. фільм.
1.40 Маст. фільм.
3.45 Маст. фільм.

---

9.30, 19.30, 21.45 Футбол. Фестываль (U-21). Групавы этап.
10.30, 15.45 Веласпорт. «Тур Італіі».
11.30, 1.15 Чэмпіянат свету. «Транссібірскае ралі».
12.00, 21.30 Футбол. «На шляху да «Еўра-2008».
12.15 Футбол. Ліга чэмпіёнаў. Фінал.
14.00 Футбол. Чэмпіянат Еўропы (U-17). Фінал.
18.30 «Вікінг» (бег з перашкодамі).
19.00 Футбол. Еўрагалы.
23.45 Покер.
0.45 Экстрэмальны спорт.
1.45 «За кулісамі Формулы-1».
2.15 Вось гэта дзіва!!!

### 23.10 ФІЛЬМ ДНЯ

**«ПРЫСТАНАК ЗЛА-3» (ФРАНЦЫЯ—АЎСТРАЛІЯ—ГЕРМАНІЯ—ВЯЛІКАБРЫТАНІЯ—ЗША, 2007 г.)**



Бясстрашная Эліс зноў бярэцца за зброю. Гэтым разам ёй давядзецца змагацца з карпарацыяй «Амбрэла», якая працуе над рэалізацыяй новага забойнага праекта. На свабоду вырваўся вірус, які робіць з жыхароў Зямлі крыважэрных зомбі.

**Рэжысёр** — Расел Малкэхі. **У ролях:** Міла Іовавіч, Адэд Фехр, Алі Лартэр, Йен Глен, Майк Эпс, Спенсер Лок, Ашанці, Гэры Хадсан.

## СУБОТА, 24 МАЯ

---

6.30 Дак. серыял «Гісторыі Міжземнамор'я».
6.55 «Раўнавага: асяроддзе пражывання».
7.25 Існасць.
7.50 Добрай раніцы, Беларусь!
9.00, 12.00, 14.25, 18.00 Навіны.
9.05, 12.15, 14.20, 17.55, 21.45 Еўрабачанне. Бялград-2008.
9.10 Здароўе.
9.45 Серыял «Залатая цешча».
10.20 Шпілька.
10.55 Тайны смак.
11.25 Ранішняя хваля.
12.20 Камедыя «Артыстка з Грыбава».
13.55 «Беларуская песня ў Сібіры».
14.35 Навіны рэгіёна.
14.55 Формула-1. Гран-пры Манака.
16.05 Алімпійская віза. На шляху да Пекіна-2008.
16.35 Дак. цыкл «Нябачны фронт».
16.50 Вакол планеты.
17.30 Зона Х.
18.20 «Ваша лато».
19.20 Камедыя «Прынцы паветра».
21.00 Панарама.
22.00 «Еўрабачанне-2008». Фінал.
1.00 Камедыя «Еўратур».

---

7.00 «Суботняя раніца».
8.00, 9.00, 16.00, 20.30, 3.00 Нашы навіны.
9.05 Серыял «Сябры».
9.35 «Здароўе».
10.20 «Смак».
10.55 «Адваротны адлік». «Пісьмо з мінулага».
11.25 «Кароль містыфікацый».
12.25 «Выкрадзеныя НЛА».
13.55 «Настольны тэніс. Турнір серыі Пра Тур. Belarus Open 2008».
16.10, 21.00, 3.20 Навіны спорту.
16.15 Камедыя «Містэр нянь».
17.50 «У свеце людзей».
18.55 «Адзін супраць усіх».
20.00 Вялікая палітыка.
20.30 Нашы навіны.
21.05 Маст. фільм «Майкл».
23.00 Што? Дзе? Калі?
0.20 Трылер «Падстава».
2.00 «Пражэктарпэрысхілтан».
3.25 Маст. фільм «Каратэ Кід-2».
5.20 Вялікія авантурысты. «Сонька—Залатая ручка».
6.30 «Дзеля смеху».

---

7.45 Дак. серыял «Свет вачамі жывёл».
8.10 Серыял «Філ з будучыні».
9.00 Свая кампанія.
10.05 Урачэбныя тайны з доктарам А. Цярэшчанкам.
10.45 Сезон у дачы.
11.25 Школа рамонту.
12.30 Добрыя навіны.
13.05 «Касмапалітэн».
14.10 «Тэатр. Выбранае...». М@рт. Кантакт». III Міжнародны тэатральны форум.
14.55 «І смех, і слёзы, і каханне». Спектакль.
17.15 Баскетбол. НБА. Матч плей-оф.
19.00 «Спорт, спорт, спорт...». Марына Знак.
19.35 Камедыя «Той, хто прайграе, атрымае ўсё».
21.25. Анекдот. LAD.
21.45 Футбол. Кубак Лібертадорэс. 2008. Агляд гульняў.
22.25 Хакей. НХЛ. Агляд тыдня.
23.00 Меладрама «Лаўкач і Хіпоза».

---

6.20 «Я — падарожнік».
6.45 «Ваенная тайна».
7.35 «Прыгоды кенгуранят». Мультсерыял.
8.00 Серыл «Трое зверху-2».
9.00 «Наш дом».
9.25 «Вуліца Гогаля».
10.25 «Прачніся і спявай».
11.00 «Мінск і мінчане».
11.30 Серыял «Турысты».
12.25 Маст. фільм «Таёжная аповесць».
14.05 «Геркулес». Мультсерыял.
14.30 «Новыя падарожжы дылетанта».
15.00 «Народжаныя ў СССР».
15.45 «Відзьма-нявідзьма».
16.30, 19.30 «24 гадзіны».
16.40 «Фантастычныя гісторыі».
17.30 «Наша справа».
17.40 «Прыватныя гісторыі».
18.30 «Паспець усё».
20.00 «СТБ-спорт».
20.10 Маст. фільм «Хуткасць 2: кантроль над круізам».
22.30 «Крутыя рабяты».
23.30 Маст. фільм «Тры гісторыі».
1.30 «Бла-бла-шоў».
2.25 Драма «Саранча».

---

4.55 Афіша.
5.00, 12.20 Казка «Як Іванка-дурань за цудам хадзіў».
6.50 Дак. серыял «Гэтыя цудоўныя жывёлы».
7.50, 14.05 Мультсерыял «Кароль малпаў».
8.20 «У гасцях у Мінуткі».
8.30. 14.30 Серыял «Знакаміты Джэт Джэксан».
9.00, 12.00, 15.00, 18.00, 21.00 Навіны Садружнасці.
9.10 «Слава за хвіліну».
10.10 «Мар, дзейнічай, будзь!».
10.30 «Вялікая будоўля».
11.00 «Хіт-экспрэс».
12.10 «Любімыя акцёры».
15.20 «Рандэву з зоркай».
15.55 Афіша прайма
16.00 Серыял «Фердынанд Цудоўны».
17.00 «У нашу гавань заходзілі караблі».
18.20 Маст. фільм «Гэта не я, гэта — ён!».
20.30 «Дзень пасла».
21.20 Маст. фільм «Калыска будзе калыхацца».
23.25 Серыял «Горац 3».
0.25 Маст. фільм «Рытмы песень».

---

9.00, 15.50, 18.55, 23.10 «Навіны кіно».
9.05, 23.35 «Метэапрагноз».
9.10 «Адзінка ў кубе».
9.30, 14.45 Мультпарад.
9.55 «К-гульні».
10.00 «Хіт-парад тэлечата».
10.30 «Героі коміксаў на экране».
12.15 Тэатр на экране. «Утаймаванне ўпартай»
16.00 «Адшукваецца адпачынак».
16.30 «Хіт-парад тэлечата».
17.00 Маст. фільм «Радня».
19.00 Камедыя «Еўратур».
20.45 «Вечарніца».
21.00 «К-відэа для ўсёй сям'і».
21.05 Маст. фільм «Бандыты».
23.20 Мультфільмы для дарослых.

---

7.00 Добрай раніцы, Расія!
7.55 «Ваенная праграма».
8.20 Мультсерыял «Марскія сабакі».
8.45 «Дыялогі пра жывёл».
9.15 Ранішняя пошта.
9.55 «Сінеманія».
10.25 Гарадок.
11.00, 14.00, 19.00 Весткі.
11.10 Мясцовы час. Весткі—Масква.
11.20 «Суботнік».
12.05 «100 самых вялікіх адкрыццяў». Дак. серыял.
13.00 «Вакол свету».
14.20 Маст. фільм «Чыстае неба».
16.20 «Смяяцца дазваляецца».
17.45 «50 бландзінак». Інтэлектуальнае шоў.
19.20 «Суботні вечар».
21.15 Маст. фільм «Ідэальная жонка».
23.10 Маст. фільм «Ядавіты плюшч-2».

---

7.00 «Добрай раніцы, Расія!»
8.30 Мультфільм.
8.35 Камедыя «Дзяўчына з характарам».
10.00, 13.00, 19.00, 3.00 Весткі.
10.10 Весткі — Масква.
10.20 «Біблейскі сюжэт».
10.50 Серыял «Семнаццаць імгненняў вясны».
12.00 Мультфільм.
12.05 «Хто ў доме гаспадар».
12.30 «Розначытанні».
13.15 Серыял «Свая каманда».
14.05 Мультфільмы.
14.30 «За сямю пячаткамі».
15.05 «Вакол свету».
15.50 «Партытуры не гараць».
16.20 «Формула ўлады». Ясуо Фукуда — прэм'ер-міністр Японіі.
16.50 «Белы цыган. Мсціслаў Запашны».
17.35, 5.45 «Магія кіно».
18.15, 2.15 Серыял «Пуцейцы».
19.20, 3.20 «Культурная рэвалюцыя».
20.25, 4.15 «Суботні вечар».
22.00 Еўрабачанне-2008. Міжнародны конкурс выканаўцаў. Фінал.
6.25 «Шырокі фармат».

---

7.30 «Мультфільм».
8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
8.20 «Казкі Бажэнава».
8.45 «Агляд».
9.15 «Без рэцэпта».
10.25 «Галоўная дарога».
10.55 «Кулінарны паядынак».
11.55 «Кватэрнае пытанне».
13.25 «Асабліва небяспечны!».
14.05 Камедыя «Шосты элемент».
16.25 «Жаночы погляд». Патрысія Каас.
17.05 Серыял «Адвакат».
19.45 «Прафесія — рэпарцёр».
20.25 Праграма «Максімум».
21.30 «Рускія сенсацыі».
22.35 «Ты не паверыш!».
23.30 Трылер «Імпульс».
1.10 «Дас іст фантасціш».
5.20 Маст. фільм.

---

7.00 АБВГДэйка.
7.30 Праваслаўная энцыклапедыя.
8.00 «Жывая прырода». «Кошкі-забойцы».
8.45 «Гісторыя дзяржавы Расійскай».
9.05 «Бобік у гасцях у Барбоса». Мультфільм.
9.20 Маст. фільм.
10.30, 13.30, 16.30, 23.05 Падзеі.
10.45 «Рэпарцёр».
11.05 Лінія абароны.
11.50 «Сто пытанняў да дарослага». Ала Дзямідава.
12.40 Гарадскі сход.
13.45 «Навошта Сталін стварыў Ізраіль».
14.35 Маст. фільм.
16.45 Пятроўка, 38.
17.00 «Народ хоча ведаць».
18.00 Маст. фільм.
20.00 «Пастскрыптум».
21.10 Маст. фільм.
23.20 «Асабістае спатканне». Памяці Міхаіла Таніча.
0.25 Маст. фільм.
2.40 Маст. фільм.

---

9.30 Тэніс. «Легенды «Ралан Гароса». А. Агасі — А. Мядзведзеў.
10.30, 18.30, 1.30 Футбол. Фестываль (U-21). Групавы этап.
11.30, 1.00 Чэмпіянат свету. «Транссібірскае ралі».
12.00, 16.00 Велатур. «Тур Італіі».
13.30 Футбол. Еўрагалы.
14.00 Футбол. Кубак УЕФА. Жанчыны. Фінал.
21.30 «Вікінг» (бег з перашкодамі).
22.00 Кікбоксінг.
2.30 «За кулісамі Формулы-1».

### 21.05 ФІЛЬМ ДНЯ

**«МАЙКЛ» (ЗША, 2004 г.)**



Яго завуць Майкл. Ён жыве дзесьці ў глушы, ён любіць выпіць, жанчын і разгульнае жыццё, ён проста анёл... Не верыце? А ў яго, як і належыць, ёсць крылы, і ён творыць маленькія цуды — цуды, якія так патрэбны людзям...

**Рэжысёр** — Нора Эфран. **У ролях:** Джон Траволта, Эндзі МакДаўэл, Уільям Херт, Боб Хоскінс, Роберт Пастарэлі.

## НЯДЗЕЛЯ, 25 МАЯ

---

5.55 Меладрама «Прыгавор».
8.25 Альманах падарожжаў.
9.00, 12.00, 14.25 Навіны.
9.10 Арсенал.
9.35 Серыял «Залатая цешча».
10.15 Культурныя людзі.
10.55 Nota Bene.
11.25 У свеце матораў.
12.10 Камедыя «Артыстка з Грыбава».
13.45 «Калыска цывілізацый».
14.10. Дак. цыкл «Нябачны фронт».
14.35 Навіны рэгіёна.
14.55 Формула-1. Гран-пры Манака.
16.55 Футбол. Ліга чэмпіёнаў. Відэачасопіс.
17.25 Парламент у асобах.
18.05 Суперлато.
19.00 Меладрама «Мужчына павінен плаціць».
21.00 Панарама тыдня.
22.30 Мастацкая гімнастыка. Шоў зорак.
0.05 Камедыя «Лёгкія грошы».
0.50 Усе стыхіі.

---

7.00 «Нядзельная раніца».
8.00, 9.00, 16.00, 3.00, 5.00 Нашы навіны.
9.05 Нядзельная прапаведзь.
9.20 Серыял «Сябры».
9.55 «Бесталковыя нататкі».
10.15, 5.05 Пакуль усе дома.
11.05 Фазэнда.
11.40 «Ранішняя пошта».
12.30 «Разумніцы і разумнікі».
13.10 Маст. фільм «Тайны мадам Вонг».
15.00 «Жонка для алігарха».
16.15, 3.10 Навіны спорту.
16.20 «Міжнародная панарама».
16.40 Фільм «Другая кніга джунгляў».
18.20 «КВЗ». Прэм'ер-ліга.
20.00 Контуры.
21.05 «Дыханне планеты».
21.35 Драма «Канчатковы аналіз».
23.50 «Камедзі Клаб».
0.25 «Настольны тэніс. Турнір серыі Пра Тур. Belarus Open 2008».
2.30 «Ціхі дом» на канскім кінафестывалі.
3.15 Маст. фільм «Выкраданне чараўніка».

---

7.40 Звон.
8.05 Мір вашаму дому.
8.15 Бухта капітанаў.
9.00 Наша пяцёрачка.
10.05 Не ў час.
10.45 Школа рамонту.
11.45 Клуб былых жонак.
12.55 «Лабірынты: святыя абразы».
13.20, 23.35 ПРАсоўванне+.
13.40 Гаспадар.
14.15 Святло далёкай зоркі. Маргарыта Громава.
14.45 «Азёрная адысея». Возера Селяхі.
15.15 «Страсці па культуры».
16.00 Серыял «Дзве зоркі».
17.15 Сольны канцэрт Аляксандра Новікава.
18.45 Меладрама «Рабро Адама».
20.20 Тэлебарометр.
20.40 Правы чалавека.
21.00 Анекдот. LAD.
21.20 Баявік «Праклятце залатой кветкі».
0.05 Баскетбол. НБА. Агляд тыдня.

---

6.05 «Клуб «Белы папугай».
6.50 Фільм-казка «На залатым ганку сядзелі».
8.00 Серыял «Трое зверху-2».
8.55 «Аўтапанарама».
9.25 «Відавочца прадстаўляе: самае смешнае».
10.20 «Вялікае снеданне».
11.00 «Добры дзень, доктар!»
11.30 Серыял «Турысты».
12.25 Камедыя «Печкі-лавачкі».
14.15 «Здаровае дзяцінства».
14.30 «Лінія лёсу».
15.00 «Культурнае жыццё».
15.30 «Відавочца прадстаўляе: самае шакіруючае».
16.30 «24 гадзіны».
16.50 «Кармен — назаўсёды!». Да 75-годдзя беларускай оперы.
17.50 «Далёкія сваякі».
18.10 «Чуткі. Скандалы. Сенсацыі. Расследаванні».
19.00 «Аўтапанарама».
19.30 «Тыдзень».
20.30 Драма «Малена».
22.30 «Спартыўны тыдзень».
23.00 «Чэмпіянат свету па ралі». Італія.
0.00 «Па поўнай праграме».
0.35 Серыял «Мяне завуць Эрл».

---

4.55 Афіша.
5.00, 12.20 Камедыя «Прахіндзіяда, або Бег на месцы».
6.50 Дак. серыял «Загубленыя светы».
7.50, 14.05 Мультсерыял «Кароль малпаў».
8.20 «Мільён пытанняў аб прыродзе».
8.35, 14.30 Серыял «Знакаміты Джэт Джэксан».
9.00 «Паэзія Арменіі».
9.15 «Рэспубліка сёння».
9.30 «Суседзі».
9.45 «Тэрыторыя KG».
10.05 «Даведнік».
10.30 «Тайны забытых перамог». «Забыццё Бурана».
11.00 «Ведаем рускую».
12.00 «Навіны Садружнасці».
12.10 «Любімыя акцёры».
15.00 «Без палітыкі».
15.20 «Супраць мафіі».
16.00 Серыял «Фердынанд Цудоўны».
17.00 «У нашу гавань заходзілі караблі...».
18.00 Маст. фільм «Спартак і Калашнікаў».
20.00 «Разам».
20.55 Маст. фільм «Сабатаж».
22.40 «Паўночнікі».
23.25 Серыял «Горац-3».
0.25 «Кома».
1.15 Маст. фільм «Калыска будзе калыхацца».

---

9.00, 16.55 «К-гульні».
9.05, 23.30 «Метэапрагноз».
9.10 «Адшукваецца адпачынак».
9.30 «Мультпарад».
9.50, 21.00, 23.25 «Навіны кіно».
10.00 «Мой любімы гадаванец».
10.15 Маст. фільм «Бандыты».
12.15 Драма «Кво вадзіс».
14.30 «Жыццё, поўнае радасці».
15.00 «К-відэа для дзяцей».
15.20 Фільм для дзяцей.
17.00 «Куміры мінулага». Брыджыт Бардо ў фільме «І бог стварыў жанчыну».
19.00 Баявік «У тыле ворага».
20.45 «Вечарніца».
21.05 «Зялёны дом».
21.20 Маст. фільм «Фрыда».

---

7.00, 11.00, 14.00, 19.00 Весткі.
7.10 Камедыя «Чароўная сіла».
8.25 Мультсерыял «Марскія сабакі».
9.00 Студыя «Здароўе».
9.35 «Смехапанарама».
10.05 «Сто да аднаго».
11.15 «Сам сабе рэжысёр».
12.10 Дак. серыял «Старажытныя адкрыцці».
13.25 «Формула ўлады». Намбарын Энхбаяр — Прэзідэнт Манголіі.
14.20 Маст. фільм «Мачаха».
16.05 Весткі. Дзяжурная часць.
16.25 «Сумленны дэтэктыў».
17.00 «Танцы з зоркамі».
20.00 «Спецыяльны карэспандэнт».
20.35 Маст. фільм «Касмічны каўбоі».
23.00 Маст. фільм «Спатканне на адну ноч».

---

7.00, 10.00, 13.00 Весткі.
7.10 Весткі—Масква.
7.20 Маст. фільм «Без вестак зніклы».
8.35 Мультфільм.
8.45 «Пакой смеху».
9.30 «Падарожжы натураліста».
10.10 Весткі—Масква. Тыдзень у горадзе.
10.50, 23.55 Серыял «Семнаццаць імгненняў вясны».
11.55 Мультфільмы.
12.20 «Сам сабе рэжысёр».
13.15 Серыял «Свая каманда».
14.05 Мультфільмы.
14.20 «Зборная Расіі».
14.50 «Гарадок».
15.15 «Набытак рэспублікі».
15.30 «Музычныя тэатры Расіі».
16.10 «У Вашым доме». Бела Давідовіч і Дзмітрый Сітавецкі.
16.50 «Тым часам».
17.45 «Сумленны дэтэктыў».
18.15, 2.15 Серыял «Пуцейцы».
19.00, 3.00 Весткі тыдня.
20.05, 3.55 «Спецыяльны карэспандэнт».
20.30, 4.20 «Лінія жыцця». Марыя Аронава.
21.25, 5.10 «Аншлаг і Кампанія».
23.10 «Аўтапартрэт». Міхаіл Шэмякін.

---

7.35 «Дзікі свет».
8.00, 10.00, 13.00, 16.00 Сёння.
8.15 «Іх норавы».
8.50 «Усё адразу!».
9.25 «Ядзім дома!».
10.25 «Quattroruote».
10.55 «Авіятары».
11.25 Баявік «Дзеці шпіёнаў».
13.25 «Крамлёўскія дзеці».
14.20 Камедыя «Забойны футбол».
16.25 «Барацьба за ўласнасць».
17.05 Серыял «Адвакат».
19.00 Сёння. Падагульняючая праграма.
20.00 «Чыстасардэчнае прызнанне».
20.40 «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
21.25 «Галоўны герой».
22.25 «Нядзельны вечар».
23.45 «Футбольная ноч».
0.15 Трылер «Сведка».

---

4.40 Маст. фільм.
6.25 Фактары жыцця.
6.55 Дзённік падарожніка.
7.25 Сялянская застава.
8.00 «Жывая прырода». «Вадапой».
8.45 «21 кабінет».
9.15 «Рэальныя гісторыі». Смешныя людзі.
9.50 «Дэтэктыўныя гісторыі». «Прыгаварыць да вышэйшай меры».
10.30, 23.50 Падзеі.
10.40 Маст. фільм.
12.10 «Запрашае Барыс Ноткін». Ігар Бутман.
12.40 «Фабрыка думкі». Ідэя для Расіі.
13.30 Падзеі. Маскоўскі тыдзень.
14.00 «Гісторыя дзяржавы Расійскай».
14.25 «Скандальнае жыццё» з Вольгай Б. «Дачныя войны».
15.15 Маст. фільм.
17.05 Маст. фільм.
19.05 Маст. фільм.
20.00 «У цэнтры падзей».
21.00 «Катала. Брудныя гульні «капіталістычнага ідэаліста». Дак. фільм.
21.50 Маст. фільм.
0.05 Маст. фільм.
2.35 Маст. фільм.
4.25 Мультпарад.

---

9.30, 17.00 Веласпорт. «Тур Італіі».
10.15 «За кулісамі Формулы-1».
10.45 Аўтагонкі. Суперкубак Паршэ.
11.30, 0.30 Чэмпіянат свету. «Транссібірскія ралі».
12.00, 18.30 Тэніс. Roland Garros.
21.30 Тэніс. «Гейм, сэт і Матч».
21.45 Валейбол. Алімпійская кваліфікацыя.
23.15 Футбол. Фестываль (U-21). Групавы этап.
0.15 Мотаспорт па выхадных.
1.00 Пляжны валейбол.

### 20.30 ФІЛЬМ ДНЯ

**«МАЛЕНА» (ЗША—ІТАЛІЯ, 2000 г.)**



Мы глядзім на Малену з перспектывы Рэната, закаханага падлетка, які незаўважна ідзе за прадметам свайго захаплення. І мы бачым, якая адзінокая Малена ў свеце мужчын, якія яе жадаюць, і жанчын, што яе ненавідзяць.

**Рэжысёр** — Джузепе Тарнаторэ. **У ролях:** Моніка Белучы, Джузепе Сулфаро, Лучыяна Федэрыка, Мацільда Піана, П'етра Натарыяні, Гаэтано Аронiка, Джылберта Ідонеа.

---

### TV1000

**ПАНЯДЗЕЛАК, 19 мая**

3.00, 21.30 Баявік «Абуджэнне смерці».
5.00 Фантастыка «13-ы раён».
6.50 Камедыя «Проста сябры».
8.30 Драма «З Афрыкі».
11.10 Баявік «Шпіёнскія гульні».
13.20 Камедыя «Салодкая свабода».
15.10 Камедыя «Маленькая міс Маркер».
17.00 Драма «Уваходзьце без стуку».
19.00 Трылер «Малхоланд Драйв».

**АЎТОРАК, 20 мая**

3.00, 21.00 Баявік «Хронікі Хуаду: Лязо ружы».
5.00 Трылер «Малхоланд Драйв».
7.30 Камедыя «Салодкая свабода».
9.20 Камедыя «Маленькая міс Маркер».
11.00 Драма «Уваходзьце без стуку».
13.00 Камедыя «Электрычны вершнік».
15.00 Вестэрн «Рустэр Когберн».
17.00 Камедыя «Бацькі».
19.00 Драма «Лізавета».

**СЕРАДА, 21 мая**

3.00, 21.00 Драма «Несалодкае жыццё».
5.00 Драма «Лізавета».
7.00 Камедыя «Электрычны вершнік».
9.00 Вестэрн «Рустэр Когберн».
11.00 Камедыя «Бацькі».
13.00 Меладрама «Песня факела».
15.00 Фантастыка «Сэрца і душы».
17.00 Драма «Вайна».
19.00 Драма «Апошняя вайна».

**ЧАЦВЕР, 22 мая**

3.00, 20.30 Драма «У імя бацькі».
5.10 Драма «Апошняя вайна».
7.20 Меладрама «Песня факела».
9.00 Фантастыка «Сэрца і душы».
11.00 Драма «Вайна».
13.00 Фантастыка «Поле цудаў».
15.00 Камедыя «Мышыная валтузня».
16.30 Драма «Гарылы ў тумане».
19.00 Камедыя «А вось і Полі!»

**ПЯТНІЦА, 23 мая**

3.00, 21.10 Трылер «Белы шум».
5.00 Камедыя «А вось і Полі!»
7.00 Фантастыка «Поле цудаў».
9.00 Камедыя «Мышыная валтузня».
10.30 Драма «Гарылы ў тумане».
13.00 Камедыя «Вяселле на Каляды».
15.00 Маст. фільм «Заткніся і застрэль мяне».
16.30 Драма «Любоўныя пісьмы».
18.00 Драма «Кінг Конг».

**СУБОТА, 24 мая**

3.00, 21.00 Драма «Балада аб Джэку і Роуз».
4.50 Драма «Кінг Конг».
8.00 Камедыя «Вяселле на Каляды».
9.30 Маст. фільм «Заткніся і застрэль мяне».
11.00 Драма «Любоўныя пісьмы».
13.00 Камедыя «Даддлі Справядлівы».
15.00 Камедыя «Білі Мэдысан».
16.30 Камедыя «Ноцінг Хіл».
18.30 Драма «Гарбатая гара».

**НЯДЗЕЛЯ, 25 мая**

3.00, 21.00 Драма «Маці».
5.00 Драма «Гарбатая гара».
7.30 Камедыя «Даддлі Справядлівы».
9.00 Камедыя «Білі Мэдысан».
11.00 Камедыя «Ноцінг Хіл».
13.00 Камедыя «Лютыя стварэнні».
14.30 Камедыя «Чэрчыль ідзе на вайну!»
16.00 Меладрама «Мемуары гейшы».
18.30 Меладрама «Прывід оперы».
21.00 Драма «Маці».

---

### Discovery Channel

**ПАНЯДЗЕЛАК, 19 мая**

7.00, 14.45 Нараджэнне аўтамабіля.
7.25, 15.10 Войны на звалцы.
8.20, 12.55 Заезды.
9.15 З чаго гэта зроблена?
10.10, 16.05. 2.00 «Трукачы».
10.40 Вялікія машыны.
11.05. 20.00 Разбуральнікі легенд.
12.00 «Пятая перадача».
13.50, 6.05 Каралі будоўляў.
16.35, 2.25 Магутныя машыны.
17.00, 4.45 Махінатары.
18.00, 5.40 «Як гэта працуе».
19.00, 3.50 Амерыканскі чопер.
21.00 Брудная работка.
22.00, 2.55 Самыя крутыя ў свеце хлопцы.
23.00 Выжыць любой цаной.
0.00 Крыміналісты.
1.00 Ідэальная катастрофа.

**АЎТОРАК, 20 мая**

7.00, 14.45 «Нараджэнне аўтамабіля».
7.25, 15.10 Войны на звалцы.
8.20, 12.55 Заезды.
9.15, 18.00, 5.40 «Як гэта працуе».
10.10, 16.05, 2.00 «Трукачы».
10.40, 16.35, 2.25 Вялізныя машыны.
11.05, 20.00 Разбуральнікі легенд.
12.00 Махінатары.
13.50, 6.05 Каралі будоўляў.
17.00, 4.45 Ствары матацыкл.
19.00, 3.50 Амерыканскі чопер.
21.00 Брудная работка.
22.00, 2.55 Мегаавіяносцы.
23.00 Авіяносец — горад у акіяне.
0.00 Крыміналісты.
1.00 Ідэальная катастрофа.

**СЕРАДА, 21 мая**

7.00, 14.45 «Нараджэнне аўтамабіля».
7.25, 15.10 Войны на звалцы.
8.20, 12.25 Заезды.
9.15, 18.00, 5.40 «Як гэта працуе».
10.10, 16.05, 2.00 «Трукачы».
10.40, 16.35, 2.25 Вялізныя машыны.
11.05, 20.00 Разбуральнікі легенд.
12.00 Ствары матацыкл.
12.55 Заезды.
13.50, 6.05 Каралі будоўляў.
17.00, 4.45 «Мітусня з «жуком».
19.00, 3.50 Амерыканскі чопер.
21.00 Брудная работка.
22.00, 2.55 Эверэст: за мяжой магчымага.
23.00 «Якія цудам выратаваліся — крутыя здымкі».
0.00 Крыміналісты.
1.00 Ідэальная катастрофа.

**ЧАЦВЕР, 22 мая**

7.00, 14.45 «Нараджэнне аўтамабіля».
7.25, 15.10 Войны на звалцы».
8.20, 12.25 Заезды.
9.15, 18.00, 5.40 «Як гэта працуе».
10.10 «Трукачы».
10.40, 16.35. 2.25 Вялізныя машыны.
11.05, 20.00 Разбуральнікі легенд.
12.00 «Мітусня з «жуком».
13.50, 6.05 Каралі будоўляў.
16.05, 2.00 «Звар'яцелыя на труках».
17.00, 4.45 «Круты цюнінг».
19.00, 3.50 Амерыканскі чопер.
21.00 Брудная работка.
22.00, 2.55 Празорлівыя сведкі.
23.00 Апошнія суткі: Ганна Нікаль Сміт.
0.00 Крыміналісты.
1.00 Ідэальная катастрофа.

**ПЯТНІЦА, 23 мая**

7.00, 14.45 «Нараджэнне аўтамабіля».
7.25, 15.10 Войны на звалцы.
8.20, 12.25 Заезды.
9.15 «Як гэта працуе».
10.10, 16.05, 2.00 «Звар'яцелыя на труках».
10.40, 16.35, 2.25 Вялізныя машыны.
11.05, 20.00 Разбуральнікі легенд.
12.00 «Круты цюнінг».
13.50, 6.05 Каралі будоўляў.
17.00, 4.45 «Пятая перадача».
18.00, 5.40 «З чаго гэта зроблена?».
19.00, 3.50 Амерыканскі чопер.
21.00, 2.55 Брудная работка.
22.00 «Місія: неверагодная!».
23.00 Амерыканскія калымагі.
0.00 Выжыць любой цаной.
1.00 Ідэальная катастрофа.

**СУБОТА, 24 мая**

7.00, 13.50, 3.50 Авіяносец — горад у акіяне.
7.55, 14.45 Мегаавіяносцы.
8.50, 15.40 «З чаго гэта зроблена?».
9.45, 16.35, 4.45 У свеце машын.
10.10, 18.00 Зброя будучыні.
11.05, 19.00 «Місія: неверагодная!».
12.00 Махінатары.
12.55 «Пятая перадача».
17.00, 2.55 «Мітусня з «жуком».
20.00 Амерыканскія калымагі.
21.00, 5.10 За кулісамі сусветнага чэмпіянату па ралі.
22.00, 6.05 Амерыканскі чопер.
23.00 Стварэнне хотродаў: стань асам»
0.00 Самыя крытыя ў свеце хлопцы.
1.00 Эверэст: за мяжой магчымага.
2.00 «Якія цудам выратаваліся — крутыя здымкі».

**НЯДЗЕЛЯ, 25 мая**

7.00, 13.50 Нафтавыя вышкі: да сёмага поту.
7.55, 14.45, 2.55 Каралі будоўляў.
8.50, 16.35, 4.45 Неверагодная хуткасць.
9.15 Заўзятыя рыбакі.
9.45 Рыбакі ў джунглях.
10.10 Кашалоты — прыстасоўваючыся да нечаканасцяў.
11.05, 2.00 Выжыць любой цаной.
12.00, 2.55 Смяротны ўлоў.
12.55 «Якія цудам выратаваліся — крутыя здымкі».
15.40 «Як гэта працуе».
17.00 «Круты цюнінг».
18.00, 5.10 Стварэнне хотродаў: стань асам!
19.00 За кулісамі сусветнага чэмпіянату па ралі.
20.00 Амерыканскі чопер.
21.00, 6.05 Разбуральнікі легенд.
22.00 Зброя будучыні.
23.00 Смяротная зона.
0.00 Апошнія суткі. Ганна Ніколь Сміт.
1.00 Празорлівыя сведкі.

---

### TV XXI

**ПАНЯДЗЕЛАК, 19 мая**

9.00, 17.00, 1.00 Фантастыка «Гадзіла: Апошняя вайна».
11.10, 19.10, 3.10 Камедыя «Метад Сакрата».
13.05, 21.05, 5.05 Драма «Забойнае лета».
15.20, 23.20, 7.20 Трылер «Ціхая».

**АЎТОРАК, 20 мая**

9.00, 17.00, 1.00 Трылер «Водаправодчык».
10.20, 18.20, 2.20 Драма «Зігзаг».
12.05, 20.05, 4.05 Баявік «Вялікая маўклівасць».
13.50, 21.50, 5.50 Камедыя «Удар па сістэме».
15.20, 23.20, 7.20 Трылер «Задыяк».

**СЕРАДА, 21 мая**

9.00, 17.00, 1.00 Камедыя «Патопім Мону».
10.40, 18.40, 2.40 Трылер «Ілюзія гульні».
12.05. 20.05, 4.05 Меладрама «СВ (Спальны вагон)».
13.40, 21.40, 5.40 Камедыя «Лулу назаўжды».
15.25, 23.25, 7.25 Трылер «Тая, што выжыла».

**ЧАЦВЕР, 22 мая**

9.00, 17.00, 1.00 Камедыя «Смяротныя грахі цудоўнай сямёркі».
10.50, 18.50, 2.50 Драма «Страсці па Лютэру».
12.55, 20.55, 4.55 Камедыя «Горад жанчын».
15.15, 23.15, 7.15 Трылер «Выкрадальнік целаў».

**ПЯТНІЦА, 23 мая**

9.00, 17.00, 1.00 Камедыя «Хто прыходзіць у зімовы вечар».
10.35, 18.35, 2.35 Драма «Навальнічны панядзелак».
12.10, 20.10, 4.10 Трылер «Мальперцюі».
13.50, 21.50, 5.50 Драма «Восем палос у Хэмільтоне».
15.25, 23.25, 7.25 Трылер «Павук».

**СУБОТА, 24 мая**

9.00, 17.00, 1.00 Камедыя «Вяселле на Ражство».
10.30, 18.30, 2.30 Трылер «Адпушчэнне грахоў».
12.10, 20.10, 4.10 Меладрама «Брэйк поінт».
13.55, 21.55, 5.55 Драма «Надзея Каталіны».
15.25, 23.25, 7.25 Баявік «Трагедыя Паміра». 1-я серыя.

**НЯДЗЕЛЯ, 25 мая**

9.00, 17.00, 1.00 Камедыя «Манашкі ва ўцёках».
10.35, 18.35, 2.35 Драма «Мішэн».
12.10, 20.10, 4.10 Камедыя «Шлюб з выхаднымі днямі».
13.45, 21.45, 5.45 Камедыя «Забойствам няма канца».
15.25, 23.25, 7.25 Баявік «Трагедыя Паміра». 2-я серыя.

*У праграме магчымыя змяненні. Перадрукоўка праграмы забаронена!*

# І КАМФОРТНЫ АБУТАК МОЖА БЫЦЬ МОДНЫМ!

***Да летняга абутку мы заўсёды прад'яўляем павышаныя патрабаванні — у першую чаргу ў плане камфортнасці. Пагадзіцеся, нават у туфлях з натуральных матэрыялаў бывае цяжка вытрываць цэлы працоўны дзень, калі калодка няўручная, скура цвёрдая, абцас высакаваты. Для людзей, якія прывыклі цаніць камфорт, якасць, спалучэнне класікі і апошніх модных тэндэнцый, абутак прадпрыемства «Отіко» — аптымальны выбар.***

***І «верх», і падкладка мадэляў у «Отіко» вырабляюцца з натуральных матэрыялаў. Форма калодкі адпавядае форме ступні. Падэшва з успененага поліурэтану забяспечвае лёгкасць, гнуткасць, добрую амартызацыю і счапленне з паверхняй. Такі абутак з'яўляецца як бы натуральным працягам чалавечай ступні.***

***Кожны сезон «Отіко» на 30—35 працэнтаў абнаўляе сваю мадэльную лінейку. Большая частка навінак прыжываецца і паступова ператвараецца ў класіку. Не менш як 70 працэнтаў прыхільнікаў абутку «Отіко» можна смела назваць пастаяннымі пакупнікамі. Дастаткова аднойчы набыць пару туфляў ці ботаў, ацаніць якасць і камфортнасць, каб потым заўсёды аддаваць перавагу менавіта гэтай маркі.***

## Выгоды двухслойнай падэшвы

ЗАТ СП «Отіко» паспяхова асвоіла выпуск абутку метадам ліццявога мацавання падэшвы, што забяспечвала выключную трываласць спалучэння падэшвы з верхам абутку. Можаце быць упэўненыя, што і праз месяц, і праз год носкі ці пасля прагулкі пад даждҗом падэшва не адстане, як гэта бывае з клеявымі мадэлямі.





Акрамя таго, прадпрыемства — першы і пакуль адзіны ў Беларусі вытворца абутку на двухслойнай поліурэтанавай падэшве.

Гэта павысіла зносаўстойлівасць і забяспечыла аптымальны тэмпературны рэжым. Зімой такая падвоеная падэшва лепш захоўвае цяпло, летам абараняе ступню ад перагрэву. Пры мінус 15 класічны поліурэтан пачынае «шкляннець», з-за чаго падэшва становіцца больш слізкай. У ботах «Отіко» з падвоеным слоем поліурэтану выдатнае счапленне з паверхняй захоўваецца пры тэмпературы да мінус 20-25 градусаў па Цэльсію.

— Больш за 60 працэнтаў аб'ёму прадукцыі мы прадаём на экспарт, у асноўным у Расію, дзе тэмпературны рэжым больш суровы, чым у нас, асабліва зімой, — тлумачыць генеральны дырэктар прадпрыемства Галіна Аляксандраўна БЯЛЕВІЧ. — Каб пашырыць рэгіёны рэалізацыі, мы сталі ўкараняць двухслойную падэшву і ў жаночы абутак (пачыналі выключна з мужчынскіх мадэляў). І ў першы ж год выпуску прадалі больш за 8 тысяч пар азначанага асартыменту. Гэта вельмі добры паказчык. Атрымаўшы такі відавочна станоўчы вынік, працягнулі развіваць тэму двухслойнай падэшвы ў веснавых і ў асенніх мадэлях.

Яшчэ адным бясспрэчным плюсам двухслойнай падэшвы, які ўжо ацанілі прафесійныя вадзіцелі і аўтааматары, з'яўляецца яе масла- і бензаўстойлівасць. Калі вы выпадкова наступіце на разліты бензін ці пройдзеце ў машыну па масляных плямах, асаблівых праблем не ўзнікне і з класічным поліурэтанам, а вось калі вы рэгулярна сутыкаецеся з гэтымі рэчывамі — праз месяц-другі падэшвы стануць крохкімі. Двухслойнаму поліурэтану такія выпрабаванні не страшныя.

## Мода, універсальнасць, камфорт

Навінкай вясенне-летняй калекцыі абутку «Отіко» сталі жаночыя басаножкі. Раней з-за спецыфікі прымяняемых тэхналогій «Отіко» выпускала толькі адзін від адкрытага жаночага абутку — з адкрытай пяткай. Спецыялісты называюць яго «прыстасаваным» (скура прыліваецца па ўсім перыметры, а потым лішкі выразаюцца). На прадпрыемстве даўно асвоены макасіны з дэкаратыўнай скразной перфарацыяй, жаночыя туфлікі, у якіх вельмі камфортна ў халаднаватае надвор'е, аднак для спёкі класічных басаножак у асартыменце «Отіко» да апошняга часу не было. Пакуль не ўкаранілі новую нямецкую тэхналогію.



Кацярына КАЗНАЧЭЕВА (на пярэднім плане) працуе на ўчастку раскрою дэталяў абутку.

Басаножкі «Отіко» больш лёгкія і гнуткія, чым іх клеявыя «браты». Мяккая вусцілка басаножка не абмяжоўвае гібкасці ступні, прымушае яе працаваць.

Артапеды падлічылі, што вышыня абцаса для абутку паўсядзённага карыстання павінна складаць ад 2 да 5 см. У басаножках «Отіко» вышыня прыўзнятасці абцаснай часткі з'яўляецца аптымальнай — 3—4 см. Дзякуючы наяўнасці ў новых мадэлях шнуровак і раменьчыкаў на спражцы ці засцежцы «велькра», любая жанчына можа адрэгуляваць паўнату, падагнаць абутак па сваёй назе.

Каляровая гама басаножак адпавядае апошнім модным тэндэнцыям: гэта шэры ў самых розных спалучэннях і варыяцыях, прыродныя афарбоўкі — пад рэптылію, пад драўніну, пад штучна састараны матэрыял і г.д. Знешні выгляд, форма падэшвы таксама пераклікаюцца з дасягненнямі сусветнай моды. Дынамічныя лініі, строгі сілуэт робяць басаножкі больш універсальнымі, даюць магчымасць камбінаваць іх з самымі рознымі стылямі адзення.

## Абутак у стылі «кэж'юэл»

На пачатку сваёй работы ЗАТ СП «Отіко» выпускала выключна мужчынскі абутак. З часам асартымент папоўніўся жаночымі і дзіцячымі мадэлямі, а доля мужчынскіх у агульным аб'ёме прадукцыі скарацілася да 50 працэнтаў. Аднак гэта не значыць, што ў мужчын выбар стаў меншым. Аб'ёмы вытворчасці прадпрыемства за 15 гадоў узраслі ўдвая. За гэты час мадэльная лінейка мужчынскага абутку неаднаразова абнаўлялася і абагачалася. Сёння акрамя традыцыйнай класікі, якая карыстаецца нязменным попытам, «Отіко» прапануе сваім пакупнікам абутак новага фармату. Гэта больш маладзёжныя мадэлі, у якіх паўсядзённы камфорт удала спалучаецца з элементамі спартыўнага дызайну (кэж'юэл) — модныя, стыльныя, камфортныя.

— Сярод маладых людзей сёння шмат прыхільнікаў здаровага ладу жыцця, — тлумачыць Галіна Аляксандраўна, — якія хацелі б насіць красоўкі, або кеды не толькі падчас заняткаў спортам. Нашы мадэлі ў стылі кэж'юэл даюць ім такую магчымасць. Матэрыялы для гэтых мадэляў мы выкарыстоўваем толькі самыя лепшыя: натуральную скуру з рознымі відамі апрацоўкі. У летняй калекцыі актыўна прымяняем нубук (у адрозненне ад гладкай скуры, якая мае некалькі слаёў прапітак і афарбовак, нубук больш мяккі і лепш «дыхае», што вельмі важна для такога абутку). Багатая каляровая гама, разнастайныя дэкаратыўныя элементы (лакавыя і замшавыя ўстаўкі, дэкаратыўныя строчкі) робяць маладзёжны абутак «Отіко» адметным і запамінальным.

Дзіцячы абутак «Отіко» (з 32-га па 41-ы памер) добра фарміруе ступню, развівае яе мышцы. У фірменным магазіне і секцыях можна знайсці элегантныя зімовыя боцікі, лёгкія летнія туфлікі з адкрытай пятачнай часткай і перфарацыяй, восеньскія класічныя мадэлі на шнурочках, «ліпучцы», «маланцы», з дэкаратыўнымі ўстаўкамі і строчкамі ў шырокай каляровай гаме. Усё гэта робіць дзіцячы абутак не толькі камфортным, але і вельмі прывабным знешне.



Майстар участка Анжаліка ШКУРСКАЯ са студэнткай-практыканткай профільнага каледжа Вікторыяй ЛАЗАР.

— На жаль, далёка не ўсё з таго, што мы дэманструем на спецыялізаваных кірмашах і выставах, потым трапляе на паліцы магазінаў, — расказвае дырэктар прадпрыемства. — Наш гандаль, асабліва на перыферыі, аддае перавагу ў асноўным класічным мадэлям і колерам. І гэта тычыцца не толькі дзіцячага абутку.

## Бразільская скура для беларускіх туфляў

Згодна з апошнімі медыцынскімі даследаваннямі за год праз ступню дарослага чалавека выдзяляецца да 50 літраў поту. Безумоўна, для многіх гэты паказчык больш сціплы, аднак знойдзецца і шмат тых, для каго памянёная асаблівасць функцыянавання арганізма з'яўляецца сапраўднай праблемай. Асабліва летам.



Добра вядома, што лепшы абутак — гэта абутак з натуральных матэрыялаў. Сінтэтыка «ўсмоктвае» і назапашвае вільгаць, у выніку чаго праз нейкі час туфлі набываюць пах, ад якога потым немагчыма пазбавіцца. З натуральнай скурай усё інакш: яна «дыхае». Нават калі вам давялося прабегчы марафонскую дыстанцыю, дастаткова пакінуць абутак на суткі «праветрыцца», каб не мець потым далікатнай праблемы з пахам.



Зборшчыцы аб'ёмнай нарыхтоўкі Алена ЗЯНЕВІЧ і Наталля ШЛОМАН.

— Наш абутак прызначаны для паўсядзённага карыстання, чалавек носіць яго больш за 8 гадзін у суткі, — расказвае Галіна Аляксандраўна, — таму мы прымяняем толькі тыя матэрыялы, якія забяспечваюць камфорт і доўгі час могуць захоўваць выдатны знешні выгляд. Гэта «лицевая» скура, спілак, нубук. На жаль, 70 працэнтаў матэрыялаў «Отіко» імпартуе з-за мяжы. Скуру для верха ўжо 13 гадоў завозім з Бразіліі. Безумоўна, нам куды зручней і танней было б закупляць матэрыялы на суседнім скураным заводзе, а не за акіянам. Праблема ў тым, што беларускія вытворцы не вырабляюць гладкую скуру патрэбнай нам якасці. У многім гэта абумоўлена нізкай якасцю зыходнай сыравіны і тэхналогіямі, якія прымяняюцца на заводах. Калі ж у іх і атрымаецца вырабіць партыю высакаякаснай скуры, яе цана будзе працэнтаў на 30 вышэйшай за бразільскую. А вось для падкладкі мы закупляем скуру Бабруйскага камбіната. Падкладачны матэрыял у нас на 100 працэнтаў айчынны.



## Гандляваць таксама трэба ўмець

— Незалежна ад узросту і памеру нагі чалавек хоча, каб яго абутак быў не толькі камфортным, але і модным. Сёння ў модзе бліскучыя, лакавыя паверхні, афарбоўкі «пад метал». У нашу веснавую і летнюю калекцыі мы актыўна ўводзім лакавыя элементы, скуру з аздабленнем пад «метал». Вырабляем мадэлі з натуральнай скуры з бляскам пад бронзу, серабро, медзь, золата. Не абмінаем увагай і прыродную палітру: афарбоўку пад скуру рэптыліі і іншых жывёл. Увогуле, каляровая гама ў нас вельмі багатая. Вось толькі ў продажы гэтую разнастайнасць не заўсёды можна знайсці. Прычын тут некалькі.

З аднаго боку, у значнай частці спажыўцоў існуе стэрэатып выбару абутку: абутак павінен быць максімальна ўніверсальным (і ў сэнсе колеру таксама) і не патрабаваць асаблівага догляду. Чорны і светлы (белы, шэры) самыя дэмакратычныя колеры — і ў плане камбінавання, і ў плане догляду.

З другога боку — у нашай краіне пакуль недастаткова паглыблена спецыялізацыя абутковых магазінаў і аддзелаў. Незалежна ад памеру магазіна, плошча абутковага аддзела падзяляецца толькі на 3 секцыі: мужчынскую, жаночую і дзіцячую. Аднак сусветная практыка паказвае, што, напрыклад, у межах жаночай секцыі асобнымі паліцамі павінны быць прадстаўлены мадэлі і з улікам узросту, і стылю жыцця, і ўзроўню даходаў. За мяжой спартыўны абутак ніколі не будзе выстаўляцца побач з класічнай «шпількай», а зойме сваё месца ў асобнай секцыі.

— У нашым гандлі з-за абмежаванасці плошчаў абутак розных стыляў сабраны на паліцах разам, — гаворыць Галіна Бялевіч. — Калі мы толькі пачалі вырабляць маладзёжныя мадэлі (стыль кэж'юэл), у адным са сталічных магазінаў нам заявілі, што наша «маладзёжка» ў іх зусім не прадаецца. Маўляў, нехадавы тавар. Мы выехалі паглядзець, як наш абутак выстаўлены. Высветлілася, што сучасны маладзёжны абутак яны размясцілі паміж хатнімі тапкамі і гумавымі ботамі. Зразумела, чаму там не было продажу: у гэты куток аддзела зазіралі толькі тыя, каму былі патрэбны тапкі ці гумавыя боты.

І яшчэ адна важная заўвага. Наш гандаль зацікаўлены ў тым, каб прадаваць імпартны абутак, бо ён значна даражэйшы за айчынны. Гандляваць ім больш выгадна. Менавіта таму так званы «расійскі Кітай» выстаўляецца на самым бачным месцы, а беларускія мадэлі — незалежна ад якасці і стылю — размяшчаюцца па перыметры абутковай секцыі, «уперамежку» і без неабходнага асвятлення.



У нас ёсць свой фірменны магазін, які нашага абутку прадае ў год больш, чым чатыры найбуйнейшыя ўнівермагі Мінска. Вельмі важна не толькі зрабіць якасны тавар, але і здолець яго прадаць. Існуюць спецыяльныя схемы размяшчэння прадукцыі, методыкі продажу. А наша сістэма гандлю — у дачыненні да айчынных тавараў — часта ігнаруе гэтыя правілы рынку.

Днямі асаблівую ўвагу да развіцця айчыннага абутковага гандлю праявілі сталічныя ўлады, якія зацікаўлены ў стварэнні канкурэнцыі імпарту. Самае важнае і складанае пытанне, якое трэба абавязкова вырашыць для дасягнення азначанай мэты, — прадаставіць беларускім вытворцам новыя плошчы пад фірменныя магазіны і секцыі па даступных расцэнках.

— Павільён у гандлёвым цэнтры «Сталіца» мы не змаглі сабе дазволіць узяць з-за высокай арэнднай платы, — тлумачыць дырэктар ЗАТ СП «Отіко».

— Таму мы са свайго боку прапанавалі іншы варыянт: дазволіць нам не арэндаваць, а набываць гандлёвыя плошчы, напрыклад, у мікрараёнах новай забудовы, у «спальных» раёнах, дзе сёння абутковы гандаль практычна адсутнічае. Калі горад зацікаўлены ў стварэнні дастойнай канкурэнцыі імпартным таварам, можна было б хоць бы на першым этапе прадастаўляць айчынным вытворцам ільготы на арэнду гандлёвых памяшканняў.



Швейны ўчастак: зборшчыца абутку Святлана БУСЬКО.

## Будучыня — за фірменным гандлем

Больш як 60 працэнтаў аб'ёму сваёй прадукцыі «Отіко» вывозіць за межы Беларусі. Асноўную долю — у Расію (90 працэнтаў экспарту), яшчэ 5-6 працэнтаў — у Літву. Зараз заключаны кантракты на прамыя пастаўкі ў Казахстан і ва Украіну.

— Апошнія 5 гадоў у нас выключна станоўчае знешнегандлёвае сальда, — гаворыць Галіна Аляксандраўна. — Высокай якасці нашай прадукцыі давяраюць многія аптовыя закупшчыкі. Вяртанне неліквіднага тавару ў нас не перавышае 0,1 працэнта. Дзякуючы гэтаму адкрыты стабільныя каналы паставак у 27 рэгіёнаў Расіі, у тым ліку ва Уладзівасток, Паўднёва-Сахалінск, Хабараўск і г.д.

На ўнутраным рынку сярод айчынных вытворцаў абутку «Отіко» займае пятае месца па аб'ёмах рэалізацыі. Гэтая лічба магла б быць большай, калі б не абмежаванасць абаротных сродкаў.

— Сёння канкурэнтаздольнасць тавараў народнага спажывання ў цэлым і абутку ў прыватнасці залежыць не толькі ад цаны і знешняга выгляду, але і ад таго, ці можа вытворца пракрэдытаваць свайго аптовага пакупніка (мінімум на 60 дзён, а лепш — на 120). Выгада такой гандлёвай палітыкі становіцца відавочнай на прыкладзе работы фірменных секцый. Калі дырэкцыя магазіна ведае, што плаціць трэба будзе толькі за рэалізаваны тавар, яна закажа ў нас больш шырокі асартымент. У спажыўца з'явіцца шырэйшы выбар, адпаведна павялічыцца аб'ём продажу.

У савецкі час існавала аптовае звяно гандлю — базы, якія выконвалі важную функцыю па фарміраванні асартыменту. Яны заказвалі пэўны пералік тавараў у вытворцаў і рабілі ў сябе сезонныя назапашванні. Пачынаючы з чэрвеня, яны закуплялі ў фабрык зімовы асартымент і потым прапаноўвалі магазінам гатовую калекцыю да кожнага сезона. Сёння ўсю нарыхтоўчую работу робяць самі вытворцы. Ужо ў маі яны распачынаюць выпуск зімовых мадэляў, якія ў лепшым выпадку пачнуць рэалізоўвацца ў канцы жніўня. А да той пары боты будуць чакаць свайго часу на складах. Прадпрыемства нясе расходы (аплата матэрыялаў, спажытай электраэнергіі, заробак рабочым і г.д.), якія зможа кампенсаваць толькі праз паўгода. І пры гэтым трэба будзе яшчэ пракрэдытаваць не толькі аптовых закупшчыкаў, але і рознічныя магазіны, якія набудуць зімовую калекцыю.

— Усё гэта прыводзіць да таго, што нам даводзіцца задзейнічаць вялікія крэдытныя рэсурсы, — тлумачыць генеральны дырэктар «Отіко», — што ў многім абмяжоўвае нашы магчымасці, стрымлівае рост аб'ёмаў вытворчасці. Для таго, каб нам наладзіць выпуск новага асартыменту — жаночых адкрытых басаножак — спатрэбілася не толькі новая аснастка, але і новае швейнае, зацяжное абсталяванне. Летась толькі на закупку абсталявання мы патрацілі 1 мільярд 300 мільёнаў рублёў. У першым квартале гэтага года — яшчэ 460 мільёнаў. І гэта трэба рабіць пастаянна. Калі мы спынімся — адстанем ад канкурэнтаў, згубім давер пакупнікоў.

Аптовай базе трэба аддаць тавар з той жа адтэрміноўкай, што і гандлёваму прадпрыемству, ды яшчэ са скідкай супраць розніцы (у 7—10 працэнтаў). У мінулым годзе ўзровень рэнтабельнасці ў нас склаў 17 працэнтаў. Калі мы 10 з іх «спішам» на скідку для базы, застанецца толькі 7 працэнтаў. Гэта вельмі мала для развіцця вытворчасці. А калі ўлічыць інфляцыю, атрымаецца, што мы ўвогуле не зможам развівацца.

Аптымальнае выйсце для вытворцаў, якім яно бачыцца Галіне Аляксандраўне, — крэдытаванне ўласнай гандлёвай сеткі. Безумоўна, гэта дарога, але і выгадна. Так, наяўнасць сваіх гандлёвых пунктаў дазваляе прадпрыемству праводзіць сезонныя назапашванні не на складах, а ў самых фірменных магазінах. Частка спажыўцоў любіць рабіць пакупкі загадзя, тым больш, калі тавары выстаўлены па старой (мінулага сезона) цане.

— Як толькі ў нашага беларускага гандлю з'явіцца рэальная канкурэнцыя ў выглядзе сеткі фірменных магазінаў, ён і сам пачне праяўляць большую зацікаўленасць у продажы айчынных тавараў, — перакананa Галіна Аляксандраўна. — Калі гаварыць непасрэдна пра наш фірменны магазін, заўважу, што ў ім прадстаўлены не толькі абутак «Отіко». 65—70 працэнтаў асартыменту — гэта наша прадукцыя, а астатнія 30 працэнтаў — абутак іншых буйных беларускіх вытворцаў. Можна правесці аналогію цягніка з вагончыкамі. У адным выпадку ў якасці цягніка можа выступаць наш тавар (скажам, сям'я прыйшла па новыя зімовыя боты для мужа, а заадно знайшла і «шпільку» на выхад для жонкі). У другім выпадку цягніком можа паслужыць тавар нашых калег. Уласна сваёй прадукцыяй мы не «закрываем» увесь мадэльны рад (напрыклад, мы не выпускаем абцасны абутак). А ў любым спецыялізаваным абутковым магазіне павінны быць прадстаўлены максімальна разнапланавыя мадэлі, вось мы і запаўняем свае «прабелы» асартыментам іншых беларускіх вытворцаў. Ведаю, што некаторыя буйныя прадпрыемствы ў сваіх фірменных гандлёвых пунктах выстаўляюць выключна свой тавар. Мы так рабіць і не плануем: для нас больш выгадна гандляваць сумесна з іншымі вытворцамі.





## Адчуйце розніцу!

Калі гаварыць пра немалаважны для кожнага пакупніка цэнавы фактар, трэба адзначыць, што тут «Отіко» трымаецца на ўзроўні астатніх беларускіх прадпрыемстваў сваёй галіны. Асноўная доля абутку «Отіко» разлічана на спажыўца з сярэднім узроўнем даходаў, аднак ёсць у асартыменце і прадукцыя «эканом-класа». Такія мадэлі вырабляюцца з больш танных матэрыялаў і камплектуючых (якія, між іншым, таксама з'яўляюцца натуральнымі). У плане зносаўстойлівасці яны ні ў чым не саступаюць мадэлям асноўнага асартыменту.

Адзінае, што і абумоўлівае іх меншую цану, — гэта больш сціплы знешні выгляд. Увогуле, здаровая канкурэнтная барацьба — натуральны стрымліваючы фактар у вызначэнні цаны на тавары «Отіко» як на ўнутраным, так і на знешнім рынку.

Многія адзначаюць, што кітайскі абутак больш танны. Але ж гэта сінтэтыка.

— Як на нафту, золата, брыльянты, так і на натуральную скуру існуюць устаноўленыя сусветныя цэны, — тлумачыць Галіна Аляксандраўна. — І калі кітайскія вытворцы прапануюць абутак з сапраўднай скуры, а не падробку, выкарыстоўваюць такія ж высакаякасныя матэрыялы і перадавыя тэхналогіі, яны проста не змогуць апусціць цану на свой тавар ніжэй за нашу.

Калі ж гаварыць пра беларускі абутак, прывядзём толькі адзін прыклад. Мужчынскія штодзённыя туфлі з натуральнай скуры нямецкай фірмы ў Мінску каштуюць не меней за 70 еўра. Аналагічная пара «Отіко» (якая па якасці ні ў чым не саступае замежнаму тавару) — 70-90 тысяч беларускіх рублёў. Мадэль «эканом-класа» і таго менш — 55—60 тысяч. Як кажуць, адчуйце розніцу.

## Стабільны заробак плюс дастойны «сацыяльны пакет»

Сёння на прадпрыемстве «Отіко» працуе 650 чалавек. У асноўным — жанчыны. Удалае размяшчэнне вытворчых карпусоў (у цэнтры горада, побач са станцыяй метро «Фрунзенская») значна аблягчае работнікам маршрут з дому на працу і назад (вытворчы працэс вядзецца ў дзвюхзменным рэжыме).

Прыкладна 40 працэнтаў калектыву — былыя выпускнікі каледжа лёгкай прамысловасці.

Цякучасць кадраў на прадпрыемстве нязначная, сярэдні заробак — адзін з самых высокіх у «абутковай» галіне (ад 500 да 850 тысяч рублёў). Дастойны сацыяльны пакет: кожны работнік мае права на аплатны 30-дзённы чарговы адпачынак (20 дзён летам і 10 зімой) і адначасова на матэрыяльную дапамогу. «Отіко» аплачвае 80 працэнтаў кошту санаторных і 40 працэнтаў турыстычных пуцёвак у межах Беларусі, 40 працэнтаў кошту абанементаў у спартыўныя секцыі і гурткі для сваіх работнікаў і іх дзяцей. Разам з прафсаюзам бярэ на сябе расходы па аплаце дзіцячых пуцёвак у аздараўленчыя летнія лагеры. Пяты год запар для дзяцей супрацоўнікаў прадпрыемства арганізуе аздараўленне ў Крыме.

Работнікам, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, «Отіко» прадстаўляе беспрацэнтную пазыку ў памеры ад 30 да 60 працэнтаў кошту жылля на 10 гадоў. Дзякуючы гэтай падтрымцы, каля 60 супрацоўнікаў прадпрыемства ўжо абзавяліся ўласнымі кватэрамі.

І кіруючы персанал, і рабочыя аднолькава зацікаўлены ў павышэнні сваёй кваліфікацыі, узроўню адукацыі — ад гэтага непасрэдна залежыць узровень зарплаты. Сёння больш як 50 работнікаў завочна навучаюцца ў ВНУ.

## Молада, але не зелена

Сёлета ЗАТ СП «Отіко» святкуе сваё 15-годдзе. Для чалавека — зусім яшчэ юны ўзрост, а прадпрыемства за гэты час паспела заваяваць прызнанне і на ўнутраным рынку, і за мяжой.

— Нам і надалей хацелася б захаваць станоўчую дынаміку развіцця, павялічваць аб'ёмы вытворчасці, пашыраць асартымент, — падвяла вынікі Галіна Аляксандраўна. — Мы першымі ў Беларусі пачалі выпускаць ліццявы адкрыты абутак, абутак на двухслойнай падэшве. Мы прымяняем найноўшыя тэхналогіі, сучасныя матэрыялы. У год выпускаем да 100 новых мадэляў. У нашых далейшых планах — асвоіць новы сегмент рынку — мужчынскі офісны абутак. Пастаянна наведваем міжнародныя спецыялізаваныя кірмашы і выставы, каб потым мець магчымасць прапанаваць спажыўцу самыя модныя мадэлі сезона.

*Публікацыю падрыхтавалі*
***Інга МІНДАЛЁВА,***
***Вераніка ХІЛЬКЕВІЧ,***
***Марыя ЖЫЛІНСКАЯ (фота).***



Майстар участка канчатковай зборкі аб'ёмнай нарыхтоўкі Яніна КАЛЕНІК.

**ЗАПРАШАЕМ ДА СУПРАЦОЎНІЦТВА:**

**Закрытае акцыянернае таварыства беларуска-германскае сумеснае прадпрыемства «ОТІКО»**

**220004, Рэспубліка Беларусь, г. Мінск, вул. Ціміразева, 9. Тэл. (017) 203 69 60, 203 53 40. Факс (017) 226 72 36. E-mail: otiko@solo.by**

УНП 100366972